Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

ЧЭРВЕНЬ 14 1933 г. № 129 (4673)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

СЕНЬНЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Дарожнае будаўніцтва баявы вучастак работы. Рамонт машын — баявая задача ўборачнай кампаніі (2 стар.).

ШАПІЛАВА—МАЙСКІ і БІТ. — Як нельга кіраваць гандлем (3 стар.).

Няпрымірымасьць да ўхілаў, бальшавіцкая ідэйнасьць, ваяўнічая партыйнасьць, укладзеныя ў канкрэтныя справы партыі — акрэсьлівае годнасьць камуніста (2 стар.).

ПРЫВІТАНЬНІ ПЛЕНУМУ ВСФКБ (1 стар.).

Плян рэалізацыі пазыкі па БССР выканан толькі на 90 проц. (3-я стар.).

ЛІСТЫ РАБСЕЛЬКОРАЎ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Напружанае становішча ў Аўстрыі (4 стар.).

Адкрыцьцё лёнданскай эканаміч най канфэрэнцыі (4 стар.).

ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА—БАЯВЫ ВУЧАСТАК РАБОТЫ

Важнасьць дарожнага будаўніцтва для нашай краіны з усёй сілай падкрэсьлівае выразнае і простае ўказаньне XVII канфэрэнцыі УсесКП(б) аб неабходнасьці **«па дарожным і шасэйным будаўніцтве і аўтамабілізацыі забясьпечыць больш хуткі тэмп разьвіцьця, чым па іншых відах транспарту».**

Гэта пастанова цалкам адпавядае таму бурнаму росквіту нашай сацыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі, да якіх неабходнейшым дадаткам спыняецца добрая дарога, канчатковая перамога над бездарожжам.

У 1932 годзе БССР дабілася падвычай вялікіх дасягненьняў у барацьбе за добрую дарогу. Шмат кілёмэтраў непраезджых, балотных мясцовасьцяй было апрэнута ў каменнае здзеньне. Дзесяткі, сотні тысяч калгасьнікаў і працоўных аднаасобнікаў сваім непасрэдным працоўным удзелам у будаўніцтве дэкляравалі сваё падтрыманьне партыі і ўраду і ў гэтай важнейшай рабоце. Рабочыя буйнейшых цэнтраў рэспублікі праз суботнікі забясьпечылі пракладку шмат дзесяткаў кілёмэтраў дарогі. Рад гераічных, нятуваных у практыцы дарожнага будаўніцтва узораў кладкі, ударнай работы былі паказаны асобнымі брыгадамі рабочых брукароў, кольшчыкаў і інш. Усё гэта ў свой час было адзначана ўрадам БССР. Гэтыя прыклады, вопыт работы перадавых павінны былі быць асновай у падрыхтоўцы да сэзону 1933 году.

Недахопы ў арганізацыі работы на трасе, на працудзеле насельніцтва, кібы ў рабоце грамадзкіх арганізацый у гэтай галіне, слабасьць культбытавога абслугоўваньня рабочых мінулага будзеэзону трэба было ўлічыць як кіраўніцтву Галоўдарпрансу, так і ўсім раённым партыйным і савецкім арганізацыям.

Аднак, як мы маглі бачыць з пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР «Аб ходзе выкананьня пляну дарожнага будаўніцтва», апублікаванай у «Зьвязьдзе» за 4 чэрвеня, з урокамі мінулага году ня лічыліся. На 20 мая, як аб гэтым сьведчыць пастанова ЦК і СНК, становішча дарожнага будаўніцтва характарызуецца наступнымі данымі: загатоўка каменьняў праведзе на па 73 проц., вывазка — 40 проц., вывазка гравія — 6 проц., лесу — 40 проц.; колка шашкі — 8 проц., брукаваньне — 5 проц., правіяваньне — 2 проц. Гэтыя даныя сьведчаць аб глыбокім прарыве ў пачатку выкананьня праграмы і ствараюць пагрозу срыву ўсяго пляну работ 1933 году.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР адзначылі, што Галоўдартранс ня ўлічыў поўнасьцю вопыту будаўніцтва мінулага году, значна горш падрыхтаваўся да будаўнічага сэзону, чым у 1932 годзе.

На нарадзе арганізацый, зьвязаных з дарожным будаўніцтвам, якая адбылася ў «Зьвязьдзе» 10 мая, мы выявілі адсутнасьць увагі Дарбуду з боку раду арганізацый, асабліва Наркамзему і Упаўнаркамсаўгасаў, якія закліканы ў гэтым годзе адыграць выключна важную ролю ў дапамозе дарорганам, улічваючы, што ў адрозьнень ня ад мінулага году, сёлета саўгасы, калгасы і трактарацэнтры ў значнай ступені вырашаюць лёс будаўніцтва. На гэтай-жа нарадзе мы адзначылі недапушчальную роўнадушнасьць грамадзкасьці, асабліва друку да гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай работы.

Прайшоў месяц. Ці зьмяніліся адносіны да гэтай справы раду арганізацый, газэт?

Газэты як маўчалі, так і працягваюць, за рэдкім выключэньнем (Ворша, Гомель), сваё красамоўнае маўчаньне.

Рэйд, праведзены брыгадамі «Зьвязды» і ЦКК, паказаў недапушчальныя адносіны да будаўніцтва з боку НКЗ БССР, Упаўнаркамсаўгасаў і трактарацэнтраў. Яны не зьяліся па-баявому за дапамогу дар. будаўніцтву.

У Наркамземе БССР каляндарныя пляны работ ня спушчаны па райза сельсаветам і калгасам. Там абмежаваліся пасылкай (і то толькі 31 мая) па пэрыферыі агульнага ліста з заклікам уключыцца ў штурм. Канкрэтнага дыферэнцыраванага ўказаньні арганізацыйна-інструктарскі сэктар НКЗ БССР, якому была даручана гэта справа, ня здолеў даць.

У выніку нават і тыя раёны, якія даўно скончылі сяўбу (Барысаў, Шклоў і інш.) у дарожных работах удзелу ня прымаюць.

Аналёгічнае становішча і ва ўпаўнаркамсаўгасаў і трактарацэнтрах, праўда, у апошнія вылучылі ўпаўнаважаных па дарожнаму будаўніцтву, але-ж настрой кіраўнікоў асобных трактарацэнтраў выклікае трывогу. Дырэктар Ільнатрактарацэнтру Селіванаў заяўляе, што «дарожнаму будаўніцтву мы мала дапаможам, бо невядома (?), у якім становішчы трактарны парк»... Наўрад ці трэба даказваць, да чаго могуць прывесьці такія самастраховачныя разважаньні.

Ня лепш і ў раёнах. **Старадароскі і Бабруйскі** раёны ні аднаго трактара ка работу па дарбуду не пераключылі і невядома, калі гэта будзе зроблена. Асобныя РК і РВК (Асіпавічы, Капыль) ухітраюцца выстаўляць па працу адну трэцюю частку патрэбнай рабочай сілы. Гэта справа пушчана на самацёк, ня гледзячы на вусім выразную прапанову ЦК КП(б)Б і СНК БССР усім установам, арганізацыям, райкомам партыі і райвыканкомам, якія маюць заданьне дабіцца неадкладнага рашучага пералому ў выкананьні работ па дарбудаўніцтве і **лічаць гэту работу першачарговай і асабліва важнай.**

У гэтай дырэктыве было прапанавана прыняць рашучыя меры да забясьпячэньня дарбудаўніцтва вывазкай будматар'ялаў, каменьняў, шчэбеню, гравія, лесу ў колькасьці і ў гэрміны, устаноўленыя ЦК, даводзячы нормы і тэрміны вывазкі і работ да кожнага калгасьніка і аднаасобніка.

ЦК і СНК абавязалі РК КП(б)Б і райвыканкомы, пад пэрсанальную адказнасьць сакратара РК і старшыні РВК, забясьпечыць з 1-га чэрвеня масавы выхад рабгужсілы з разьлікам поўнай вывазкі будматар'ялаў да ўстаноўленага тэрміну ЦК, г. зн. 15 ліпеня 1933 г.

І гэта важнейшая пастанова, як мы бачылі вышэй, ня выконваецца. Таварышы з месц не зразумелі ўсёй важнасьці для БССР дарожнага будаўніцтва. Між тым, загатоўкі 1932 году паказалі на практыцы нашай работы, наколькі нам перашкаджае бездарожжа ў правядзімых мерапрыемствах.

Бездарожжа — праклятая спадчына царызму, лепшы дапаможнік кулаку ў яго контр-рэвалюцыйных мэтах. «Ціхай сапай» недабіты вораг выкарыстоўвае бездарожжа для зрыву гаспадарча-палітычных задач партыі, асабліва ў глыбінных пунктах. Іменна таму клясавы вораг імкнецца сарваць дарожнае будаўніцтва. Фактаў пацьвярджэньня гэтага як з практыкі будаўніцтва мінулага, так і гэтага году шмат. Гэта павінны ўлічыць партыйныя арганізацыі на месцах.

Наша бліжэйшая задача — дабіцца рашучага пералому ў ходзе дарожнага будаўніцтва. Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР на гэтым пытаньні, як і пастанова ЦВК аб працоўным удзеле насельніцтва ў дар. будаўніцтве павінны быць ва ўстаноўленыя партыяй і ўрадам тэрміны праведзены ў жыцьцё.

Кожны населены пункт, калгас, сельсавет павінны быць неадкладна прымацаваны да поўных месц і вёдаў работы. Кантроль над выкананьнем даных заданьняў па дарожным будаўніцтве павінен быць пастаўлен такім чынам, каб кожны дзень было зусім ясна, у якім становішчы знаходзіцца гэта справа, каб можна было канкрэтна кіраваць кожным асобным вучастам работ.

Лепшы мэтад эфэктыўнага выкананьня заданьня па дарбуду — стварэньне сталых брыгад па рабоце на трасе. Калгасьнікі сваім прыкладам ударнай работы павінны пацягнуць за сабой усю масу працоўных аднаасобнікаў на лепшае і хутчэйшае выкананьне дарожных работ.

Сацыялістычныя мэтады — сацспаборніцтва, ударніцтва, буксір аснова арганізацыі работ павінны і тут заняць пачэснае месца.

Апошні тэрмін вывазкі ўсіх будматар'ялаў да трасы — ЦК КП(б)Б і СНК БССР устаноўлен 15 ліпеня.

Гэты тэрмін канчатковы, ніякіх расьцяжак дапускацца ня будзе, гэта павінны ўлічыць райкомы партыі і РВК, яны павінны мабілізаваць усю масу працоўных на пасьпяховае разгортваньне і сканчэньне плянаў дарожных работ.

Задача дарожных органаў — «арганізавана выкарыстаць працоўнае на сельніцтва на дарожных работах, зацікавіць у гэтай справе масы калгасьнікаў, добра падрыхтаваць вучаткі, забясьпечыць іх пісьменным тэхнічным кіраўніцтвам — вось, што настойліва неабходна правесьці, каб працоўны ўдзел насельніцтва на будаўніцтве і рамонце дарог даў належны палітычны і гаспадарчы эфэкт.

Але для гэтага трэба ліквідаваць адарванасьць дарожных арганізацый ад шырокай грамадзкасьці, ператварыць дарожную справу з вузка ведамственай у шырокі грамадзкі рух, у справу палітычную» (ПРАВДА»).

Хутка і добра ўзараць папары, сустрэць сенаўборку ў поўнай гатоўнасьці!

ВОРЫВА ПАПАРУ НА 5 ЧЭРВЕНЬ

РАЁНЫ	УЗАРАНА.	ПРОЦ. ДА ПЛЯНУ.
Асьвейскі	19	0,4
Аршанскі	618	7,7
Барысаўскі	1.219	17,9
Бягомльскі	278	7,0
Горацкі	79	1,0
Заслаўскі	1.391	23,2
Клімавіцкі	461	7,7
Капыльскі	184	5,7
Касьцюковіцкі	372	2,7
Дзяржынскі	1.119	16,0
Магілеўскі	417	3,5
Менскі	363	0,1
Пухавіцкі	1 266	15,9
Смалявіцкі	640	7,5
Талачынскі	744	0,5
Чэрыкаўскі	176	4,4
Шклоўскі	483	6,0
Кармянскі	53	1,0
Парыцкі	541	30,1
Рагачоўскі	847	7,1
Слуцкі	196	6,5
Старобынскі	257	21,4
Ст.-Дароскі	301	10,0
Чачэрскі	105	1,9
Ч.-Слабодзкі	1.293	51,7
УСЯГО:	**12.922**	**3,1**

СНК БССР і ЦК КП(б)Б далі зусім ясную і катэгарычную дырэктыву **— УЗАРАЦЬ ДА 25 ЧЭРВЕНЯ ЧЫСТЫЯ ПАПАРЫ!**

Папаравая кампанія — задача вялікага значэньня. Своячасова і глыбока ўзараныя папары — зарука высокіх ураджаяў.

У цэлым радзе раёнаў ворыва папараў, аднак, яўна **ІГНАРУЕЦЦА.**

Чаго варты адзін той факт, што ў сёнешній зводы фігуруюць толькі 24 раёны! Ад іншых раёнаў няма ніякіх вестак.

Вінаваты ў гэтым, зразумела, ня толькі райземаддзелы, якія не даслалі зводак.

Паўстае зусім законнае пытаньне, чаму **НКЗ БССР** і па сёнешні дзень не наладзіў выразнага кіраўніцтва папаравай кампаніяй. Справа-ж ня ў тым, каб спакойна сядзець і чакаць, пакуль райземаддзелы дашлюць весткі аб ворыве папараў. Пяцідзённы ўлік ужо можна і трэба было **АРГАНІЗАВАЦЬ.**

А ў Наркамземе абмежаваліся толькі агульнай дырэктывай, у якой абавязалі райземаддзелы дасылаць весткі. Пра кантроль, пра меры ўзьдзеяньня на людзей, якія сваёй злачынай бесадказнасьцю срываюць улік ворыва папараў, у наркамаце, скромна кажучы, забылі.

Адсюль і вынікі. Ёсьць весткі толькі ад 24 раёнаў, ды і то са спазьненьнем на цэлую пяцідзённку!

Ну і тэмпы!..

Аб чым сыгналізуюць матар'ялы з месц?

Аб яўнай **НЕДААЦЭНЦЫ,** яўным **ІГНАРАВАНЬНІ** папаравай кампаніі. Вычарпальным довадам зьяўляецца той факт, што на 24 раёнах плян ворыва папараў выканан усяго на 3,1 проц. Узарана толькі 12.922 га. Нават у тых раёнах, дзе сяўба ўжо даўно скончана, ворыва папараў разгортваецца зусім **МАРУДНА.**

Возьмем такія раёны, як Рагачоўскі, Шклоўскі і г. д. Яравыя поўнасьцю засеяны больш двух тыдняў назад. Ёсьць усе ўмовы рашуча фарсаваць ворыва папараў. Колькі-ж узарана? Зусім мала, недапушчальна мала! Рагачоўскі раён узараў да 5 чэрвеня толькі 847 гэктараў, або 7,1 проц. пляновага заданьня.

Характэрнейшая дэталь. У гэтым раёне ёсьць пэлы рад калгасаў, якія ўжо даўно поўнасьцю ўзаралі чыстыя папары. Вось, напрыклад, калгас імя Сталіна. Чыстыя папары на плошчы ў 52 га цалкам узараны і ўзараны добра — без агрэхаў, па адпаведную глыбіню. Папары ў гэтым калгасе ўзараны ў сярэднім на 15 см., што сьведчыць аб высокай якасьці ворыва.

Гэты факт яшчэ больш падкрэсьлівае тое, як дрэнна раённыя арганізацыі змагаюцца за хутчэйшае правядзеньне ворыва папараў, як слаба яны выкарыстоўваюць свае магчымасьці і вопыт перадавых калгасаў.

Практыка перадавых раёнаў нашай рэспублікі ярка паказвае, што тэрміны ворыва папараў могуць быць ня толькі вытрыманы, але і значна **СКАРОЧАНЫ.** Здолеў-жа **ЧЫРВОНАСЛАБОДЗКІ** раён яшчэ да 5 чэрвеня **ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ВОРЫВА ПАПАРАЎ НА 51,7 ПРОЦ.**

З апартуністычнай недаацэнкай папаравай кампаніі трэба рашуча і неадкладна скончыць. Жалезны, бальшавіцкі адпор найменшым дэмабілізацыйным настроям, тэндэнцыям супакойцца, так сказаць, адпачыць пасьля веснавой сяўбы.

Чыстыя папары павінны быць поўнасьцю і добра ўзараны да 25 чэрвеня — ні на адзін дзень пазьней!

Задача заключаецца ў тым, каб пабальшавіцку спалучыць прапалачныя работы, ворыва папараў і падрыхтоўку да ўборкі новага ўраджаю. Іменна ў гэтым цяпер — самае галоўнае, самае фашаючае.

Яшчэ і яшчэ раз трэба папярэдзіць аб недапушчальнасьці мелкага ворыва. Мелкае ворыва — удар па ўраджайнасьці, адна з формаў барацьбы клясавага ворага супроць умацаваньня нашых калгасаў. Ворыва трэба праводзіць на глыбіні ня менш як 12 — 15 см. і паўторнае ворыва — на поўную глыбіню (15—18 см.).

Нельга далей цярпець такога агіднага становішча, якое стварылася з улікам ворыва папараў. НКЗ БССР абавязан неадкладна арганізаваць самы выразны і своячасовы ўлік.

Узараць да 25 чэрвеня чыстыя папары і ўзараць добра — на адпаведную глыбіню без агрэхаў — вось баявая задача.

Яна можа і павінна быць **ВЫКАНАНА** па што-б там ні стала.

На 10-е чэрвеня засеяна 91,9 проц. яравых

НА 10 ЧЭРВЕНЯ ПА БССР ЗАСЕЯНА 2.461.717 ГЭКТАРАЎ. ПЛЯН СЯЎБЫ ВЫКАНАН НА 91,9 ПРОЦ.

ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР ЗАСЕЯНА 104,2 ПРОЦ., АЎСА — 96,2 ПРОЦ., ІЛЬНУ — 97,9 ПРОЦ., КАНАПЕЛЬ — 85,9 ПРОЦ., БУЛЬБЫ — 98,7 ПРОЦ. І ТРАЎ — 41,3 ПРОЦ.

ПАЎДНЁВАЯ ЗОНА ВЫКАНАЛА ПЛЯН СЯЎБЫ НА 102,6 ПРОЦ., ЦЭНТРАЛЬНАЯ — НА 99,1 ПРОЦ. І ПАЎНОЧНАЯ — НА 86,8 ПРОЦ.

СЕНАЎБОРКА ПАЧАЛАСЯ

СТАРОБІН, 11. У калгасах раёну шырока разгарнуліся прапалачныя работы. Перадавыя калгасы ўжо цалкам закончылі прапалку яравога кліну. Калгасы „ЧЫРВОНЫ ПАГРАНІЧНІК", „БАЛЬШАВІК" і „ТРЭЦІ РАШАЮЧЫ" прапалолі ўсе збожжавыя і лён.

У РАЁНЕ ПАЧЫНАЕЦЦА СЕНАЎБОРКА. Першымі прыступілі да сенаўборкі калгасы „НІВА" і імя МЯНЖЫНСКАГА. 10-га чэрвеня калгасьнікі с.-г. арцелі „Ніва" скасілі 17 га сенажаці. Калгас імя Мянжынскага за гэты-ж дзень убраў 15 га.

З 12-га чэрвеня ў калгасах раёну разгарнулася масавая сенаўборка.

ПЕРАВЫКОНВАЕМ НОРМЫ ПА КАСЬБЕ

СЛУЦАК, 12. Калгас „ПРАЛЕТАРЫ", Мялешкаўскага сельсавету, адным з першых на Случчыне поўнасьцю скончыў прапалачныя работы.

Адразу пасьля завяршэньня прапалкі калгасьнікі с. г. арцелі „Пралетары" прыступілі да сенаўборачнай. Клясава-варожыя элемэнты шалёна агітавалі супроць выхаду на сенажаць. Выкрываючы кулацкую агітацыю, калгасьнікі-ўдарнікі калгасу „Пралетары" па-баявому разгарнулі сенаўборку.

За адзін дзень убрана 8 гэктараў. Асабліва добра працуе на касьбе брыгада № 2 на чале з брыгадзірам тав. П. ПАРХІМОВІЧАМ. Кожны касец з гэтэй брыгады перавыконвае нормы выпрацоўкі на 0,8-0,9 га.

АБ ПАРУШЭНЬНЯХ КАЛГАСНАГА ЗЯМЛЯКАРЫСТАНЬНЯ У БЫХАВЕ

ПАСТАНОВА НКЗ БССР

Пры праверцы зямляўпарадчых работ у Быхаўскім раёне інспэктарам кіраўніцтва арганізацыі тэрыторыі НКЗ БССР тав. Партновым выяўлены выпадкі адрэзкі зямель у Студзянецкім сельсавеце (калгас імя 15-годзьдзя АДПУ) з агульнага колькаснага масыву для пашырэньня прысядзібных зямель калгасьнікаў.

Гэта работа праведзена старшым тэхнікам быхаўскага райземаддзелу т. Шурубавым, прычым у названым калгасе прысядзібныя вучасткі настолькі вялікія, што па сутнасьці ператвараюць прысядзібныя гаспадаркі калгасьнікаў з дапаможных у фактычна галоўныя, што пагубна адбіваецца на ўмацаваньні калектыўнай гаспадаркі, асноўнай гаспадаркі калгасьнікаў.

Гэты факт сьведчыць аб тым, што некаторыя раённыя зямельныя аддзелы не праяўляюць выстарчальнай клясавай пільнасьці і не вядуць рашучай барацьбы з яўна кулацкім сабатажам і супраціўленьнем правядзеньню ў жыцьцё пастановы ЦК УсесКП(б) «аб празьмерным росьце прысядзібных вучасткаў у Беларусі» («Правда», № 85 ад 27 сакавіка), дзе сказана: «Надалей не дапускаць адрэзкі зямлі з калгасных зямельных фондаў для прысядзібнага зямлякарыстаньня без дазволу Вышэйшай Зямельнай камісіі» і па становы ЦВК і СНК БССР ад 3 верасьня 1932 году, дзе сказана, што: «Пры захаваньні непарушнасьці ўласнасьці рабоча-сялянскай дзяржавы на зямлю—замацаваць за кожным калгасам зямлю, якая знаходзіцца ў яго працоўным карыстаньні ў існуючых зараз межах, **забараніўшы ўсякія перадзелы».**

Выходзячы з гэтага, Калегія Народнага Камісарыяту Зямляробства БССР пастанаўляе:

1. Абвясьціць суровую вымову заг. быхаўскага райземаддзелу тав. **КУЧАРАВУ** за адсутнасьць канкрэтнага кіраўніцтва і кантролю пад работай свайго апарату і дапушчэньне грубага парушэньня дырэктыў партыі і ўраду. **Прапанаваць на ПРАЦЯГУ ПЯЦІ ДЗЁН ВЯРНУЦЬ У АГУЛЬНЫ КАЛГАСНЫ МАСЫЎ НЕЗАКОННА АДРЭЗАНЫЯ ЗЕМЛІ.**

2. Старшага тэхніка быхаўскага райземаддзелу **т. ШУРУБАВА** з работы зьняць і аддаць пад суд за яўнае парушэньне пастаноў партыі і ўраду аб замацаваньні за калгасам зямлі, якая знаходзіцца ў яго працоўным карыстаньні, і забароне ўсякіх перадзелаў.

3. Прапанаваць быхаўскаму райземаддзелу растлумачыць усім калгасьнікам і ў першую чаргу калгасьнікам калгасу імя 15-годзьдзя АДПУ аб тым, што пашырэньне прысядзібных зямель калгасьнікаў за лік зямель калгаснага масыву зьяўляецца незаконным і ўсе прырэзкі павінны быць вернуты ў агульны калгасны масыў.

НАРКАМЗЕМ БССР **БЭНЭН.**

А. АЛЕКСАНДРОВІЧ, І. ХАРЫК

ЯК ЗЬНЯЛІ РАЁН З ЧОРНАЙ ДОШКІ

Дагэтуль з воду ў год вялося, што ў вёсках тэрміны сяўбы былі абавязкова зьвязаны з тым ці іншым днём «сьвятога».

— Як дзяды, так і ўнукі, усё ў свой час...

Бальшавікі ўзарвалі стары ўклад жыцьця вёскі.

Хваля калектывізацыі сьцёрла межы палоскі, зарунела бязьмежнае поле,— але шмат яшчэ ў калгасьнікаў засталося выгадаваных з пакаленьня ў пакаленьне «псыхалёгічных меж».

Звышраньняя сяўба гэтай вясны, апрача барацьбы за высокі ўраджай была яшчэ бальшавіцкай барацьбой з рэшткамі «псыхалёгічных меж»; гэта азначала ўбіць асіновы кол у старасьвецкі каляндар сяўбы.

Чаму Чырвонапольскі раён апынуўся на чорнай дошцы?

Уся падрыхтоўка да сяўбы ў дазімовы пэрыяд была правалена. Плян падняцьця зяблева быў выкананы толькі напалову.

РК КП(б)Б, накіраваўшы ў сельсаветы сваіх упаўнаважаных, не правяраў іх работу. Многія з іх не разумелі важнасьці і адказнасьці барацьбы за тэрміны сяўбы, вызначаныя партыяй і ўрадам. І самі апынуліся ў палоне «прадзедаўскага каляндару», цягнуліся ў хвасьце апартуністычных настрояў.

Калгасы ня былі своячасова ачышчаны ад клясава-варожых элемэнтаў, якія шкодзілі на полі, разбазарвалі насеньне, корм і кожнае мерапрыемства партыі і ўраду сустракалі злосным сабатажам.

Адказныя работнікі раёну недаацэньвалі значэньня працоўных аднаасобнікаў—заўтрашніх калгасьнікаў.

Ні ў адным пункце раёну ня былі арганізаваны ясьлі.

Чырвонапольская газэта «Чырвоны сьцяг» займалася толькі канстатаваньнем фактаў, не адыгрывала арганізуючай ролі ў барацьбе за бальшавіцкі ход сяўбы, рэдка дзе ў сельсаветах выпускаліся насьценгазэты.

У многіх калгасах сяўба праходзіла самацёкам, не правярялася колькаснае і якаснае выкананьне заданьняў.

Ня дзіва, што ў раёне мог існаваць такі калгас, як у Гарэзінскім сельсавеце калгас «КІМ». У гэтым калгасе заселі кулакі, якія вялі яўна шкодніцкую работу,—стрэхі хлявоў усьцілалі ільном, раскрадвалі насеньне. У гэтым калгасе да апошніх дзён ня быў агрэгаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар.

Хто-ж быў на чале сельсавету і калгасу?

Былы сакратар партыйнай ячэйкі абазаўся былым манахам, былы старшыня калгасу—брат папа гэтай-жа вёскі і разам з ім жыў да апошніх дзён, кладаўшчык калгасу—былы тарадавы, настаўнік вёскі—былы поп і т. д.

Раён павінен быў закончыць сяўбу да 20 мая. Ясна, што пры такім развароце «масавай» работы і пры такой засьмечанасьці некаторых калгасаў варожымі элемэнтамі раён ганебна сарваў вызначаны тэрмін, за што зусім заслужана быў занесен на чорную дошку.

Як-жа Чырвонапольскі раён за апошнюю пяцідзёўку мая дабіўся бальшавіцкіх тэмпаў і быў зьнят з чорнай дошкі?

Перш за ўсё быў мабілізован на ліквідацыю адставаньня абсалютна ўвесь партактыў, праведена расстаноўка сіл на мясцох. Нядобныя змагацца за бальшавіцкую лінію былі выключаны з партыі. Узор работы лепшых быў папулярызован у раёне. Зламалі настрой «сямейнай цішыні», вырасла палітычная адказнасьць кожнага камуніста за даручаную яму работу.

Чырвонапольскі раён, будучы ў прарыве, выклікае на сацыялістычнае спаборніцтва па высокаякасным завяршэньні сяўбы суседні Чырвонагорскі раён Заходняй вобласьці.

За адны суткі пры саматужна-прымітыўнай «паліграфічнай базе» было надрукавана розных лёзунгаў і адозваў 5.000 экзэмпляраў, якія былі разасланы па ўсіх сельсаветах, калгасах, дзесяцідворках. У часе перапынку на палёх па брыгадах праводзіліся лічныя мітынгі, увечары па ўсіх сельсаветах былі праведзены адкрытыя партсходы, прысьвечаныя пытаньням сяўбы і сацыялістычнаму спаборніцтву з Заходняй вобласьцю. Пра сацспаборніцтва з Чырвонагор'ем ведаў кожны калгасьнік, кожны працоўны аднаасобнік Чырвонапольля. Адстаючым калгасам арганізоўвалася масавая сацыялістычная дапамога. Працу пачалі праводзіць кругласутачна—ўначы ішло баранаваньне, возка гною і г. д.

З лепшых ударнікаў сяўбы пры брыгадах і ў калгасах пачалі стварацца камісіі кантролю якасьці. Рэвізыйныя камісіі калгасаў былі таксама ўцягнуты ў справу дбайнага кантролю за якасьцю сяўбы, быў абвешчан заклік для стварэньня добраахвотнікаў-інспэк тароў кантролю, у кніжках калгасьнікаў апрача запісу працадзён рабілася адзнака аб якасьці.

Усё гэта не магло ня даць бальшавіцкага зруху ў парастаньні тэмпаў добраякаснай сяўбы. Выпадкі сяўбы ў адпавор былі выпраўлены на-ходу, а вінаватыя ў гэтым пакараны.

31 мая Чырвонапольскі раён выканаў плян сяўбы на 100,1 проц.

Задачы, што стаяць зараз у сувязі з далейшым этапам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі патрабуюць іншага зьместу партыйнай работы. Цэнтральнае месца павінна заняць глыбокая масавая палітычная і арганізацыйная работа.

У Чырвонапольскім раёне ў разгортваньні работы па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў трэба перш за ўсё сьмела, па-бальшавіцку вырашыць праблему кадраў. Зацікаўленасьць да калектыўнай працы ў калгасьнікаў вырасла, калгасьнікі ўсьвядомілі поўнасьцю значэньне калгасаў і ўсе іх перамогі, пэрспэктыву разьвіцьця калгаснага жыцьця.

Калі калгас дрэнна працуе, гэта значыць, што тут вінаваты кіраўнікі, якія ня ўмеюць выкарыстаць уздым і энэргію радавых калгасьнікаў на ажыцьцяўленьне задач, якія былі высунуты тав. Сталіным на ўсесаюзным зьезьдзе калгасьнікаў-ударнікаў.

Дзе масавая палітычная і арганізацыйная работа на вышыні, дзе на практыцы ажыцьцяўляюцца формы сацспаборніцтва, там і бальшавіцкі плённы посьпех у рабоце.

ФІЗКУЛЬТУРНІКІ БССР—ТАВ. СТАЛІНУ

ДАРАГІ ТАВ. СТАЛІН!

Табе, лепшаму з лепшых ленінцаў — правадыру вялікай камуністычнай партыі і міжнароднага пралетарыяту, кіраўніку пераможна будуючагася сацыялізму, нашаму настаўніку, таварышу і лепшаму другу фізкультурнікаў — гарачае прывітаньне ад 200-тысячнай армії фізкультурнікаў Беларусі.

Фізкультурнікі БССР разам з усімі працоўнымі нашай рэспублікі сьвяткуюць сваё дзесяцігодзьдзе. За гэтыя дзесяць год мы дабіліся вялізарных посьпехаў на фронце барацьбы за савецкую фізкультуру. Ажыцьцяўляючы твае ўказаньні аб тым, што «нам трэба вырасьціць новае пакаленьне рабочых здаровых, жыцьцярадасных, здольных узьняць магутнасьць нашай краіны і абараніць яе грудзьмі ад нападу з боку ворага» ў практыцы сваёй дзейнасьці, праз новую савецкую сыстэму фізічнага выхаваньня «Гатоў да працы і абароны», мы ўжо зараз дабіліся вялікай перамогі на фронце барацьбы за ўсебакова фізічна разьвітых, гатовых да працы і абароны шырокіх мас працоўных.

170.000 ахоплены выпрабаваньнем, 50.000 цалкам здалі нормы па значку, — вось яркія паказальнікі таго, што мы правільна ажыцьцяўляем указаньні партыі аб фізкультурным руху.

Гэтыя посьпехі на фізкультурным вучастку агульнага фронту сацыялістычнага будаўніцтва магчымы былі толькі ў рэзультаце таго, што партыя пад тваім выпрабаваным бальшавіцкім кіраўніцтвам нястомна штодзенна клапаціцца і цаніла задачы фізічнага аздараўленьня працоўных. Мы гэта адчувалі заўсёды і гэта нас натхняла.

Даем табе, дарагі тав. Сталін, наша фізкультурнае абяцаньне: і ў далейшым з яшчэ большай энэргіяй і бальшавіцкай настойлівасьцю біцца за поўную перабудову сваіх радоў у адпаведнасьці з патрабаваньнямі партыі, за падрыхтоўку соцень тысяч здаровых, жыцьцярадасных і ўсебакова фізічна разьвітых людзей, гатовых да працы і абароны, за пабудову бясклясавага грамадзтва, за ўмацаваньне і абарону межаў краіны, дзе будуецца сацыялізм.

Няхай жыве правадыр вялікай камуністычнай партыі, лепшы друг фізкультурнікаў тав. Сталін!

ВСФК СССР тав. АНЦІПАВУ

Фізкультурнікі Беларусі, сабраўшыся на ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае Х-гадоваму юбілею ФК арганізацыі БССР, шлюць пралетарскае прывітаньне штабу савецкага фізкультурнага руху і яго кіраўніку тав. **АНЦІПАВУ.**

200.000 фізкультурнікаў у Савецкай Беларусі, 50.000 здаўных выпрабаваньні на значок «ГПА» — гэтыя посьпехі дасягнуты намі пад вашым непасрэдным кіраўніцтвам. На пароге ўступленьня ў другое дзесяцігодзьдзе мы запэўняем вас, што і надалей будзем змагацца за моцную арганізаванасьць і дысцыпліну, за масавую вучобу па «ГПА», за павышэньне якасьці масавай вучобы і спартыўнай тэхнікі. Завяванае намі ўпартай працай адно з перадавых месц у барацьбе за новую савецкую сыстэму фізічнага выхаваньня ў перадавых шэрэнгах рэспублік Савецкага саюзу мы замацуем і да фінішу сусьветнай спартакіяды прыдаем з яшчэ большымі дасягненьнямі, адным з маналітных арганізаваных атрадаў сусьветнага рэвалюцыйнага спартыўнага руху.

Няхай жыве правадыр вялікай камуністычнай партыі, лепшы прыяцель фізкультурнікаў — тав. Сталін!

Няхай жыве савецкі фізкультурны рух!

ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО

Фізкультурнікі Беларусі ў дзень сьвяткаваньня свайго дзесяцігодзьдзя шлюць палкае фізкультурнае прывітаньне штабу сацыялістычнага будаўніцтва — Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б.

Пралетарскі фізкультурны рух Беларусі за 10 год нястомнай барацьбы пад кіраўніцтвам партыі дабіўся вялікіх перамог на фронце падрыхтоўкі шырокіх працоўных мас да сацыялістычнай працы і абароны. Сьвята дзесяцігодзьдзя ФК руху ёсьць адна з буйнейшых перамог партыі на адным з вучасткаў агульнага фронту сацыялістычнага будаўніцтва. Дзесяткі і сотні тысяч пралетараў, захопленых фізічным выхаваньнем і выпрабаваньнем па комплексу «ГПА», — яркі паказальнік таго, што фізкультурны рух Беларусі шчыльна падышоў да справы вырашэньня асноўнай праблемы ўсебаковага фізічнага разьвіцьця шырокіх працоўных мас, гатовых да працы і абароны.

Фізкультурнікі БССР запэўняюць ЦК КП(б)Б у тым, што з задачамі, якія партыя перад намі паставіла, мы справімся і дамо новыя сотні тысяч працоўных, гатовых да сацыялістычнай працы і абароны.

Няхай жыве УсесКП(б) яе ленінскі ЦК на чале з правадыром вялікай камуністычнай партыі і сусьветнага пралетарыяту тав. Сталіным!

Няхай жыве ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало!

ЗА НОВАЕ ЗДАРОВАЕ ПАКАЛЕНЬНЕ!

Вышэйшаму Савету фізкультуры БССР

Шчыра вітаю ўсіх фізкультурнікаў БССР і віншую вас, таварышы, з 10-гадовым юбілеем існаваньня і працы фізкультурнай арганізацыі.

**Савецкі лад, якім кіруе наша бальшавіцкая партыя і геніяльны правадыр працоўных тав. Сталін, стварыў такія ўмовы фізічнага і духоўнага разьвіцьця шырокіх мас рабочых і сялян, што на сёнешні дзень у фізкультуру ўцягнуты тысячы і мільёны, ня тое, што ў капіталістычных краінах, дзе фізкультурай могуць займацца толькі невялікія к

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

НЯПРЫМІРЫМАСЬЦЬ ДА ЎХІЛАЎ, БАЛЬШАВІЦКАЯ ІДЭЙНАСЬЦЬ, ВАЯЎНІЧАЯ ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЙНАСЬЦЬ, УКЛАДЗЕНЫЯ Ў КАНКРЭТНЫЯ СПРАВЫ ПАРТЫІ—АКРЭСЬЛІВАЕ ГОДНАСЬЦЬ КАМУНІСТА

ЯЧЭЙКА ЗАСЬМЕЧАНА ЧУЖЫМІ ПАРТЫІ ЛЮДЗЬМІ

Сем дзён ішла праверка членаў і кандыдатаў партыі ячэйкі першага хромавага цэху Менскага чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік».

«Зьвязда» пісала ўжо, што падрыхтоўка да чысткі партыі на заводзе была праведзена дрэнна. Беспартыйных рабочых на першы сход зьявілася вусім нязначная колькасьць, ня ўсе зьявіліся члены і кандыдаты партыі.

На другі дзень памылка была выпраўлена. Кожная брыгада было растлумачана значэньне чысткі радоў партыі. Старшыня праверкому да сходу на гэту тэму газарыў амаль з кожным беспартыйным рабочым. І як тольні гудок паведаміў аб сканчэньні работы, заваднкі клюб пачаў напаўняцца рабочымі і работніцамі, якія ня бачылі ніводнага свабоднага месца.

Праверка пачалася своячасова і праходзіла з вялікай актыўнасьцю. Кожнага правяраемага камуніста крытыкавалі ўсебакова.

На трыбуне рабочы **Іван Табопін**, член партыі з 1924 г. На заводзе ён працуе з 1913 году, зараз зьяўляецца прафоргам брыгады фальварку. Брыгада ўвесь час перавыконвае прамфінплян па ўсіх паказальніках. За ўдарныя тэмпы Іван заслужыў годнасьць героя Першай пяцігодкі.

— Хто хоча выказацца,—пытае старшыня праверкому. З залі пачуліся галасы: «што там гаварыць, паболь-бы такіх рабочых ударнікаў, як т. Табопін!».

Соня Дзергай, дачка столяра. Батрачыла на вёсцы ў кулакоў. Потым паступіла працаваць на цагельны завод. Па сканчэньні сэзону Соня паступіла на сьвінаадкормачны пункт. У 1931 г. перайшла на завод «Бальшавік». У гэтым-жа годзе яе прынялі ў кандыдаты партыі. Соня не адзін раз прэміявана і таксама зьяўляецца героем Першай пяцігодкі.

— Соня працавала ў зольным аддзяленьні,—гаворыць рабочы **Ліхтман**—там яна спраўлялася куды лепш, чым некаторыя мужчыны. Соня зьяўляецца лепшым брыгадзірам арганізатарам работніц на барацьбу за якасьць прадукцыі.

На трыбуне рабочы **Берфатар Шлёма**. Берфатар член прафсаюзу з 1907 г. Яго біяграфія да Кастрычніка—гэта гісторыя барацьбы з эксплёататарамі. Зараз ён—лепшы ўдарнік у брыгадзе строгалёў, лепшы агітатар і прапагандыст у брыгадзе. У рады Ленінскай партыі Берфатар уступіў у 1930 г. Ён працуе на заводзе адзінаццаць год і ніводнага прагулу і спазьненьня ў яго ня было.

На трыбуну падымаецца член партыі **Песін**. Ён хітра ўхмыляецца, потым пачынае гаварыць так ціха, каб апрача праверкому яго ніхто не пачуў.

— Мне было пятнаццаць год, калі я паступіў працаваць прыказчыкам. Бацька мой быў пячніком. Нарадзіўся я ў 1903 годзе. Лічуся героем першай пяцігодкі. У кандыдаты партыі ўступіў у 1930 годзе. Быў у камсамоле...

А з залі:

— Здаецца ты нічога не сказаў аб дружбе з заядлым трацкістам контррэвалюцыянэрам **Змудзэкам**.

— Чаму ты ўстрымаўся ад галасаваньня супроць трацкісцкай апазыцыі? —пытае рабочы тав. **Усьцінаў**.

— Бачыце, я не галасаваў тады супроць апазыцыі Троцкага,—адказвае Песін,—бо ня ведаў, на чым баку праўда. І ведаеце, трэба вам сказаць, што я тады быў зусім малапісьменны.

Рабочыя ў сваіх выступленьнях выкрылі трацкісцкі твар Песіна. Песін не аднаразова гаварыў аб немагчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне. Гэта было год таму назад. Цяпер ён на словах цьвёрда стаіць за генэральную лінію партыі, а на справе скарыстоўвае адсталыя групы рабочых для агітацыі супроць мерапрыемстваў партыі.

Не такі Песін дурань, каб выступаць адкрыта супроць лініі партыі, ведаючы цану трацкісцкай апазыцыі, якая стала на шлях адкрытай дапамогі буржуазіі.

Празьмерную даверлівасьць кіраўнікоў парткалектыву выкарыстаў не адзін Песін.

Моўшыкаў — член партыі з 1931 году. На заводзе з 1928 г. Да гэтага часу ён на базары гандляваў гатовай сопраткай.

— Беспрацоўе тады было—гаворыць ён.—Вось мой брат шыў, а я насіў на базар прадаваць.

— Вы аб гэтым запісалі ў анкеце, калі вас прымалі ў партыю?—пытае старшыня праверкому тав. **Блоўштэйн**. Моўшыкаў пачынае разгрываць ролю дзівака, які нічога не разумее. Ён гаворыць:

— А хіба аб гэтым трэба было пісаць? А я і ня ведаў.

— Вы статут партыі ведаеце?

— Не, ня ведаю.

— Газэты чытаеце?

— Няма калі чытаць.

— Вы ўдарнік?

— Па-мойму я ўдарнік, але ніхто гэтага ня бачыць,—гаворыць Моўшыкаў.

Рабочыя **Баранаў, Левін і Дубіцкая** далі характарыстыку Моўшыкаву наступнага зьместу:

— Моўшыкаў не зьяўляецца прыкладам на вытворчасьці, наадварот, ён падрывае работу брыгады, ён выступаў супроць перагляду норм выпрацоўкі. На пазыку не хацеў падпісацца.

Сакратар пэхавай камсамольскай ячэйкі першага хромавага цэху **Энцін** прышоў на завод у 1931 годзе. У гэтым-жа годзе яго прынялі ў партыю. На чысткі Энцін хвалюецца, сам блытаецца і імкнецца заблытаць праверком.

— Бацька мой служыў у дзядзькі, які меў гарбарню. Я таксама служыў у дзядзькі, маці была прыказчыцай у магазыне дзядзькі. Мой бацька зараз працуе вартаўніком... Я—герой першай пяцігодкі...

— А я працаваў—гаворыць рабочы тав. **Эйдзінаў**,—ня толькі ў бацькі Энціна, я працаваў у яго дзеда. Усе яны былі буйнымі капіталістамі і дралі з рабочага па сем скур.

— Гэта нярэдка. Мой бацька быў заўсёды бядняк. Выступаюць супроць мяне на злосьці.

— Такім людзям, якія ўтойваюць сваё сацыяльнае паходжаньне,—гаворыць рабочы **Мірскі**,—ня месца ў радох ленінскай партыі. Яго матка была не прыказчыцай, а гандлявала ў сваім магазыне. Я гэта добра ведаю.

— Я за пераноску тавараў з гарбарні бацькі ў магазын,—гаворыць беспартыйны рабочы **Гольнікаў**, — ня раз атрымліваў «на чай». Такіх людзей, як Энцін, трымаць у партыі гэта значыць —даць клясаваму ворагу шырокае поле дзейнасьці. Гнаць такіх з партыі...

Ячэйка «экзэмпляр»—**Красьнік**. У 1930 годзе паступіў на завод, у гэтым-жа годзе быў прынят у прафсаюз, адначасова і ў кандыдаты партыі. Ён добра пісьменны, але не прызнаецца ў гэтым. Старшыня праверкому задае яму пытаньне: ці ведае ён праграму і статут партыі?

— Ня ведаў, як прымалі ў партыю, ня ведаю іх і зараз—адказвае Красьнік, А што датычыць падачы заявы, дык я не падаваў. Паступіць у партыю мяне ўгаварыў сакратар партыйнай ячэйкі Мялікоўскі. Я доўга не згаджаўся, але так, як да мяне прычапіліся, я ня мог адмовіцца.

— Вы ўдарнік?—пытае старшыня камісіі.

— Хоць мяне і ня лічаць ударнікам, але каб усе так працавалі, як я, усё-б добра было.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што парткалектыў «Бальшавіка» да справы напаўненьня сваіх радоў часта паварухоўна падыходзіў сур'ёзна ганяючыся за колькасным ростам, забываючы аб тым, што пры прыёме ў партыю трэба быць асабліва пільным. У партыю прымаліся людзі бяз усякай папярэдняй праверкі, хто яны і адкуль. І зусім ня дзіўна, што такая пастаноўка работы дала магчымасьць пралезьці ў рады не клясава-варожым і выпадковым элемэнтам.

Ход чысткі выяўляе вельмі нізкі ўзровень выхаваўчай работы на заводзе, нізкі ўзровень партыйнай вучобы. Каля 35 проц. членаў і кандыдатаў партыі першага хромавага цэху не змаглі адказаць на самыя простыя пытаньні, якія павінен ведаць кожны член партыі.

Усё гэта павінна быць улічана партыйнай арганізацыяй заводу ў далейшай барацьбе па выкананьні тых вялізарных задач, якія ўсклала партыя на кожнае сацыялістычнае прадпрыемства.

А. Манькоў.

ГНІЛЫЯ ЛІБЭРАЛЫ ПАТУРАЛІ ПЕРАРАДЖЭНЦАМ

11 чэрвеня як заўсёды рабочыя друкарні імя Сталіна атрымалі позвы на сход па чысткі са сьпісам таварышоў, якіх будуць правяраць. Правяраюцца т. т. Худзін, Шапіра, Шляпо, Каплан, Жылінскі, Юдзін і інш. (ячэйка наборнага цэху).

Клюб друкароў у 6½ гадзін увечары быў перапоўнен.

Рабочы лінатыпіст тав. **Шляпо** з малых год пачаў працаваць у Віцебскай друкарні. У 1924 годзе ён прыехаў у Менск і з таго часу працуе ў друкарні імя Сталіна.

У партыю тав. Шляпо ўступіў 2 гады таму назад. Да работы на вытворчасьці адносіцца добра. Прамфінплян заўсёды выконвае на 118-120 проц. Але партыйныя нагрузкі т. Шляпо выконвае слаба. Як парторг ён з работай не спраўляецца.

— Некалькі раз ставіў пытаньне, каб далі другую нагрузку, бо з гэтай цяжка справіцца—кажа тав. Шляпо,—але парт'ячэйка не зьвяртае ўвагі на мае просьбы.

Партвучобу тав. Шляпо наведвае слаба, таму ён слаба ведае праграму партыі, ня выконвае некаторыя пункты статуту, асабліва пункт аб членскіх узносах, па якіх тав. Шляпо мае некаторую запазычанасьць.

***

Вярстальшчык тав. **Шапіра Рыгор**, член партыі з 1925 году. За 7 год прабываньня ў партыі тав. Шапіра на здолеў стаць на галаву вышэй беспартыйных рабочых, наадварот, многія беспартыйныя прымаюць больш актыўны ўдзел у грамадзкім жыцьці і абагналі яго ў палітычным разьвіцьці. І гэта ня дзіва, бо тав. Шапіра належыць іменна да тых камуністаў, якія лічаць, што яны ўсё ведаюць, ім вучыцца ня трэба. Калі Шапіра рэкамэндавалі па ступіць у камвуз, дык ён адказаў:

— Мне камвуз нічога ня дасьць, я больш падрыхтован.

На чысткі тав. Шапіра ня змог адказаць на самыя элемэнтарныя палітычныя пытаньні. Больш таго, тав. Шапіра нават ня ведае, што такое і для чаго патрэбен прамфінплян. У сад спаборніцтве ён ня прымае актыўнага ўдзелу. Затое, тав. Шапіра мае некаторы адмоўны «баланс» чорных плям. У яго асабістай картцы запісаны 2 вымовы за п'янства і неэтычнасьць і гэтых плям тав. Шапіра ня змыў.

***

У 1930 годзе да сакратара парткалектыву друкарні тав. **Фэльдмана** прышоў стары рабочы з 29-гадовым стажам, на борцчык тав. **Худзін**.

— Партыя—авангард рабочай клясы,—кажа тав. Худзін,—хачу і я быць у авангардзе.

— Але мяне непакоіць толькі адно—кажа тав. Худзін,—справа ў тым, што мая жонка мела маленечкую крамку, бо пры царызме цяжка было жыць выключна на мае заработкі. Але я да крамкі ніякага дачыненьня ня меў. У 1922 годзе мы яе зачынілі.

— Іншых грахоў ня маеш?—пытае сакратар калектыву.

— Не, пачынаючы ад 1904 году я ўвесь час бесьперапынна стаяў каля наборнай касы і дыхаў сьвінцом.

І Худзін быў прынят у рады партыі. Ён пераварыўся ў бальшавіцкім катле, усю сваю энэргію, усе сілы аддаў партыі, аддаў рабочай клясе.

Худзін заўсёды кампэрадзе ва ўсіх правадзімых на прадпрыемствах кампаній. Актыўны ўдзельнік сацспаборніцтва. Прыкладны ўдарнік. Як інструктар фабзавучу, ён выхоўвае маладое пакаленьне наборшчыкаў, рыхтуе кваліфікаваныя кадры для вытворчасьці.

Ня гледзячы на тое, што Худзіну пераваліла за 50 год, ён добра займаецца партвучобай, зьяўляючыся адным з лепшых слухачоў вячэрняга камвузу. Не адстае і ў выкананьні партыйных нагрузак.

Характарызуюць Худзіна і старыя рабочыя, і моладзь. Гаварылі т. т. Фрыдман Н., Фрыдман Г., вучні фабзавучу, усе казалі, што Худзін варты насіць ганаровае імя камуніста.

***

Калі старшыня праверкому тав. Старавойтаў выклікаў на праверку **Каплана Мэера**, у залі стала мёртвая цишыня. Каплан рэзка, задзёрыста кідае ў сход словы:

— Бацька меў уласную друкарню з 2-х плоскіх машын. Сам пачаў працаваць у 1904 годзе. Служыў у царскай армії.

— У 1914—19 годзе быў у Нямеччыне, у палоне. Там працаваў у друкарні белагвардзейскай газэты «Русский вестник», працаваў у якасьці наборшчыка (?). У 1919 годзе вярнуўся ў Менск і да 1922 году працаваў у друкарні.

— З 1922 па 1925 год быў беспрацоўным.

Аб часох «беспрацоўя» выступаўшыя рабочыя сказалі больш за Каплана. У гэты час і доўгі час пасьля 1925 году Каплан займаўся гандлем. У «спулцы» з цесьцем яны мелі сельтарскі завод, каўбасную краму, краму дробнага гандлю, жонка мела сельтарскі ларок. Каплан часам не лянаваўся і на «чорную біржу» заглянуць.

Пры паступленьні ў партыю Каплан быў яшчэ менш адкрыты. На запытаньне праверкому, чаму ён утаіў сваё мінулае, Каплан адказвае:

— У мяне ня пыталі і я не гаварыў...

Але жыцьцё Каплана вядома многім друкаром Менску. Адзін за другім, больш 10 чалавек апавядаюць аб мінулым Каплана.

Многіх рабочых «добры» Каплан крэдытаваў. Т. т. Данкман, Каткоў і інш. зьяўляліся спажыўцамі Капланскай «каапэрацыі».

— Памятаю,—гаворыць тав. Сапожнікаў,—як нам давялося весьці барацьбу з іх братам. Мне даручылі рэквізаваць вашу друкарню. А ты, Каплан, нам аказваў даволі ўпартае супраціўленьне.

—Быў час, калі наборшчыкі вельмі патрабаваліся,—кажа тав. Рагінкін. Мы тады зварочваліся да Каплана, каб ён пашоў на работу, а ён нам адказаў:

— Што вы хочаце, каб я пашоў на ваш галодны паёк? Не, не пайду!

Сапраўдны твар Каплана, як яўнага клясавага ворага, будзе больш ясным, калі дадаць наступны эпізод.

— Я працаваў разам з Капланам,—кажа камуніст тав. Шлямбэрг.—Прыходзілася з ім мець шмат гутарак. Ён мне расказваў аб тым, як ён працаваў у Нямеччыне на карысьць буржуазіі. Каплан ня быў простым рабочым друкарні. Ён працаваў начальнікам наборнага цэху друкарні пана Мэера. У той час, як палонныя паміралі з голаду, Каплан езьдзіў па тэатрах, рэста ранах, насіў афіцэрскую вопратку, жыў па-панску. Каплан няспрасту расказваў аб гэтым. Ён меў на мэце прывіць мне белагвардзейскія погляды. З палону Мэер Каплан прывёз шмат каштоўных рэчаў. Прывёз ён і кнігі. Спачатку ён прапанаваў мне купіць кнігу «Мэндэле Мойхер Сворэм». Я гэту кнігу купіў. Пасьля ён паказаў мне белагвардзейскі слоўнік. Я і слоўнік купіў.

— Якім-жа чынам вы прынялі Каплана ў партыю, калі вы ўсе ведалі, хто ён такі?—пытае старшыня праверкому тав. Старавойтаў.

Паўстае і яшчэ адно пытаньне: чаму маўчаў т. Шлямбэрг, ведаючы, што Каплан ня толькі прапаваў з белагвардзейцамі, але і пашыраў контрэвалюцыйную літаратуру?

Каплан мог трапіць у партыю толькі таму, што ў парткалектыве друкарні імя Сталіна ёсьць шмат гнілых лібэралаў, шмат людзей з прытупленай клясавай пільнасьцю. Каплан ашукваў партыю. Але разам з ім ашуканцамі зьявіліся і Фрыдман і Шапіра, якія рэкамэндавалі яго ў партыю. Адказнасьць перад партыяй і рабочай клясай за гэта ашуканства нясуць і тыя, хто «чакаў чысткі» і своячасова ня выкрыў Каплана, як ворага з партбілетам у кішэні.

А. Левін.

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА ДРЫСЕНСКАЙ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫІ

Райкамісія па чысткі партыі прыступіла да работы з 5-га чэрвеня. У першы вечар быў праведзен сход парт'ячэйкі **савецкіх устаноў**, па якім праходзілі чыстку старшыня РКК КП(б)Б т. **Дзейна**, вылучаны ў склад камісіі па чысткі.

Сход пачаўся са спазьненьнем каля гадзіны, дзяжурчы марудную збору на сход. Гэта зьявілася паказчыкам недастатковай дысцыплінаванасьці паасобных членаў і кандыдатаў партыі.

Дрысенская партарганізацыя прыйшла да чысткі мала падрыхтаванай. Асноўным недахопам зьяўляецца тое, што падрыхтоўка да чысткі ня была цесна зьвязана з барацьбоў за пасьпяховае правядзеньне веснавой сяўбы, сяўба па раёне не закончана ў вызначаны партыяй і ўрадам тэрмін.

6-га чэрвеня быў скліканы сход райпартактыву па пытаньні чысткі партыі, на якім падкладнае сканчэньне сяўбы было пастаўлена, як адно з важнейшых мерапрыемстваў чысткі. У ажыцьцяўленьні гэтай задачы ўсе ячэйкі і кожны камуніст паасобку павінны паказаць сваю здольнасьць выконваць баявыя заданьні партыі.

На адчыненых сходах 7 і 8 чэрвеня праводзілася чыстка **паштовай і ільназавадзкой** ячэек г. Дрысы. Праверка паказала зусім слабую партмасавую і палітвыхаваўчую работу ў гэтых ячэйках, невыстарчальнае кіраўніцтва прафсаюзнымі, камсамольскімі і іншымі грамадзкімі арганізацыямі.

Пры праверцы 18 членаў і кандыдатаў партыі выяўлена, што ў выніку слабай партвыхаваўчай работы рад членаў і кандыдатаў партыі зусім палітычна няпісьменны, ня ведаюць статуту і праграмы партыі і важнейшых пастаноў партыі і ўраду, нават зьвязаных з іх работай.

Камісія вычысьціла з партыі людзей, якія ганьбілі ганаровае названьне членаў партыі.

На ўроках чысткі гэтых 2-х ячэек уся Дрысенская партарганізацыя павінна скарыстаць узросшую зацікаўленасьць членаў партыі і беспартыйных рабочых і калгасьнікаў ва ўсей партыйнай рабоце, каб узьняць яе на больш высокую ступень. Шырока разгортваючы бальшавіцкую крытыку і самакрытыку, арганізацыя павінна вывіць недахопы ў рабоце і ачысьціць свае рады ад лужакоў і клясава-варожых элемэнтаў, каб стаць больш моцнай і баяздольнай.

П. Бурачэўскі
(Старшыня Дрысенскай раённай камісіі па чысткі партыі)

ПАРАСЯ БІРКОС — адна з лепшых ударніц калгасу «Новае жыцьцё», Слуцкага району.

У Парасі 3 маленькіх дзяцей і ня гледзячы на гэта, яна за час пасяўной ня мела ніводнага прагулу.

З адчыненьнем ясьлей і саду ў калгасе, дзеці Парасі цэлы дзень знаходзяцца там, а сама яна спакойна працуе на полі.

Дзеці яе сыты і прыгледжаны.

РЫХТАВАЦЬ КАНЯ ДА УБОРАЧНАЙ

Ад своячасовай і хуткай ўборкі сацыялістычных палёў будзе залежыць колькасьць і якасьць ураджаю, выкананьне лёзунгу тав. Сталіна — «зрабіць усіх калгасьнікаў заможнымі».

Мы маем значныя посьпехі ў выкананьні дырэктыў партыі і ўраду па правядзеньні веснавой сяўбы. Яшчэ большыя перамогі мы павінны атрымаць у часе ўборкі, якая патрабуе асаблівай пільнасьці, напружанасьці і падрыхтаванасьці.

Пасьпяховае правядзеньне ўборкі ў значнай меры будзе залежыць ад падрыхтаванасьці цягавай сілы. Як і ў часе сяўбы ад становішча конскай цягавай сілы будзе залежыць правядзеньне ўборкі ў максымальна кароткія тэрміны. Таму ЦК і СНК у сваёй пастанове аб арганізацыі ўборкі патрабуюць ад партыйных і савецкіх арганізацый, дырэктароў саўгасаў, МТС і праўленьняў калгасаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на падрыхтоўку рабочай цягавай сілы да ўборкі і прапануюць:

«У чэрвені месяцы выдзеліць па калгасах і саўгасах усю замораную і непрацаздольную рабочую жывёлу, поўнасьцю вызваліць яе ад усякай работы і арганізаваць яе пашу на працягу цэлых сутак;

прыцягнуць да гэтай справы былых кавалерыстаў і найбольш вопытных конюхаў, паставіць іх аплату ў залежнасьці ад ліку галоў, прыведзеных імі ў працаздольны стан».

Усё гэта выразна гаворыць аб тым, як мы павінны адносіцца да каня і як мы павінны падрыхтаваць яго да надыходзячай уборкі.

У некаторых гаспадарках мелі месца выпадкі, калі пры няправільным выдатканьні корму коні выходзілі вясной на работу вельмі худымі, зморанымі і непрацаздольнымі. Пры гэтым рад работнікаў спасылаўся на розныя прычыны, як адсутнасьць фуражу, перагрузка коняй і г. д. Гроші цана ўсякім спасыланьням на адсутнасьць фуражу. Неабходна толькі арганізаваць правільны догляд коняй, выдзеліць змораных і непрацаздольных, поўнасьцю вызваліць іх ад усякай работы, забясьпечыць іх зялёнымі кармамі. Коні павінны пасьвіцца на пашы круглыя суткі. Трэба арганізаваць і догляд коняй на пашы ў начны час.

Конь мае вельмі шэвялікі страўнік у параўнаньні з велічынёй свайго цела. Страўнік гэты ўмяшчае ад 10 да 20 літраў ежы, у той час, як страўнік каровы ўмяшчае ад 200 да 250 літраў. Таму конь патрабуе зусім іншага спосабу кармленьня, чым буйная рагатая жывёла. Яго неабходна на карміць значна часьцей. Яму нельга даваць адразу вялікую колькасьць харчоў, бо гэта можа выклікаць розныя захворваньні. Само сабой зразумела, што калі ня даць каню харчоў на працягу цэлай ночы, гэта вельмі дрэнна адаб'ецца на яго здароўі, на яго працаздольнасьці. Ноччу вышэй коняй забавязковы, асабліва, калі прыняць пад увагу напы пакуль што неўпарадкаваныя выганы.

На палепшэньне выгаду, на рацыянальнае іх выкарыстоўваньне неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Выган для пашы коняй павінен быць асобны ад выгану для кароў. Конь зьяўляецца вельмі пераборлівай жывёлай. Ён занадта ўтаптвае траву, якая-б магла быць скарыстана з посьпехам каровамі. Выган коняй па вінен быць падзелен на асобныя 3-4 вучасткі, якія выпасваюцца паступова. Спачатку коні пасьвяцца 2-3 тыдні на першым вучастку, потым на другім і г. д. З апошняга вучастку яны зноў пераганяюцца на першы і г. д. Тэрмін пашы на кожным вучастку залежыць ад колькасьці вучасткаў і ад колькасьці травы па іх. Выган для коняй павінен быць сухім, а не балоцістым. Гэты выган праз год павінен чаргавацца з выганам для буйнай рагатай жывёлы, бо коні з ахвотай паядаюць адны расьліны, а каровы другія.

Пры пашы коняй на выгане неабходна даваць і канцэнтраваныя кармы. Патрачаны на каня авёс аплоціцца ў некалькі разоў павышэньнем яго працаздольнасьці.

Догляд за коньмі трэба даручыць былым кавалерыстам, найбольш вопытным конюхам, паставіць аплату іх працы ў залежнасьці ад ліку галоў, прыведзеных імі ў працаздольны стан.

Конь своячасова павінен быць напоен. Нельга паіць каня разагрэтага раней, чым праз паўтары гадзіны пасьля працы. З разагрэтага каня нельга зьнімаць зараз-жа хамут і сядзёлку. Трэба пачакаць, пакуль конь астыне. Разагрэтага каня нельга купаць. Невыкананьне гэтых асноўных правіл можа прывесьці да захворваньня каня.

Кожны рабочы конь павінен мець сваю абрую, якая павінна быць дапасавана да яго цела, бо кожны конь мае свае асаблівасьці ў будове плеч, грыўкі і грудзёў.

Выкананьне ўсіх гэтых элемэнтарных правіл значна павысіць працаздольнасьць нашых коняй, забясьпечыць іх падрыхтаванасьць да ўборкі.

А. ПОЛЯК.

Беларуская Акадэмія Навук.

РАМОНТ МАШЫН—БАЯВАЯ ЗАДАЧА УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ*)

У хутчэйшым часе закончыцца сяўба на палёх БССР. У некаторых раёнах ужо ярка зеляніеюць першыя ўсходы будучых ураджаяў, праведзенай кампаніяй заможнасьці. У гэтым годзе прыродныя ўмовы (раньняя вясна, шмат асадкаў і інш.) і высокая якасьць арганізаваных пасеўных работ ствараюць спрыяючыя ўмовы росту правых культур.

Задача зараз — ня даць зарасьці пустазельлем маладым уходам бальшавіцкай сяўбы. Прапалочная кампанія пачалася. Не за гарамі і ўборачная.

Не паслабляючы энэргіі на самае хутчэйшае і поўнае заваршэньне сяўбы, мы павінны фарсаваць падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі.

Рашаючае зьвяно пасьпяховага правядзеньня ўборкі ўраджаяў сацыялістычных палёў — своячасовая і поўная падрыхтоўка машын, запчастак да іх, інвэнтару і ўсіх іншых мэханізмаў.

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваёй пастанове аб вэрыве папарэў і арганізацыі ўборкі збожжавых ставяць пытаньне падрыхтоўкі машын да ўборачнай кампаніі адным з цэнтральных пунктаў. Гэта пастанова проста абавязвае **«партыйныя і савецкія арганізацыі арганізаваць справу рамонту так..., каб ніводная ўборачная машына, ніводны лёгкабіль, рухавік, ніводны трактар ня былі-б пакінуты без неабходнага рамонту»**.

Зусім выразныя і канкрэтныя формы дзеяньня дае і пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб мерапрыемствах па правядзеньні папаравай, прапалочнай і ўборачнай кампаніі.

Але ўсё гэта ня турбуе цэлы рад гаспадарчых, прафсаюзных і партыйных арганізацый. Гэта зусім ясна выявілася на нарадзе гаспадарчых, прафсаюзных і шэфскіх арганізацый, якая была склікана рэдакцыяй «Зьвязды» сумесна з **прамгрупай ЦКК-РСІ** 9 чэрвеня г. г.

«Мы ўсё яшчэ працуем па-кампанейску. Як-бы гэта перавыхаваць нашых людзей, навучыць працаваць пановаму і г. д....» — так пачаў сваё выступленьне на нарадзе прадстаўнік упаўнаважанага Наркамсаўгасаў БССР тав. **Фрыд**.

Зусім правільны дыягназ. Выключная кампанейшчына моцна ўкаранілася ў рабоце некаторых савецкіх і зямельных арганізацый. Амаль ні адзін прадстаўнік (а іх было ня мала) ня змог даць канкрэтных адказаў на самыя неабходныя пытаньні: які плян запазу і рамонту ўборачных машын і запчастак да іх, колькі па сёнешні дзень адрамантавана, выраблена запчастак і г. д.

Тыя лічбы, якія ілюстравалі прадстаўнікі на нарадзе, не адпавядаюць рэальнай сапраўднасьці. Гэта — лічбы людзей і арганізацый, якія мала, або зусім ня зьвязаны з практычным жыцьцём сваіх ніжэйшых зьвеньняў. Гэта— лічбы людзей, якія сядзяць толькі ў габінэтах, кавяюцца ў гэарытычных даведніках і на падставе гэтага выручваюць на арыфмэтрах так званыя «плянавыя наметкі». Характэрным зьяўляецца ў гэтых аппосінах плян падрыхтоўкі машын да ўборачнай кампаніі, які прачытаў на нарадзе прадстаўнік Наркамзему тав. **Старэцітараў**. Плян складзен на аснове існуючых у Наркамземе матар'ялаў аб штогоднім завозе ўборачных машын па яго сыстэме ў БССР і каафіцыенту зносу іх. Напрыклад, калі машына завезена ў 1929 годзе і тэрмін яе (паводле тэхнічнага пашпарту) — 4 гады, яна ў 1933 годзе павінна быць сьпісана з балянсу машын, а калі такая-ж машына завезена ў 1931 годзе, дык тэрмін яе службы яшчэ два гады.

Колькі-ж сапраўды ёсьць машын на палёх, якія з іх патрабуюць і якога рамонту, запчастак, колькі па сёнешні дзень фактычна адрамантавана, або атрымана запчастак — на ўсё гэтыя пытаньні прадстаўнік Наркамзему на аснове свайго «пляну» ня змог адказаць.

Аналёгічнае становішча ў гэтым напрамку Белсельгасснабу і ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў. Тав. тав. **Гладкін** (Белсельгасснаб) і **Анцюх** (Наркамсаўгасаў) выразна зачыталі свае пляны, у якіх адна графа пакрывае другую і, нарэшце, атрымліваецца «сыкопны баляно».

«Плян на запчастак, — гаворыць тав. **Гладкін**, — складзен з наяўнасьці машын, якія даў Наркамзем... Хоць у пляне ёсьць моманты значнага разыходжаньня. Па даных Наркамзему трактарных сенажасілак лічыцца 80 штук, а па нашых матар'ялах — 280. Атрымана з 1-1 да 9-VI— г. г. запчастак на 70 тыс. руб. плюс 50 тыс. руб. — астача напярэдняга году... справа як быццам ня дрэнная».

Тое-ж самае і ў Наркамсаўгасаў. Яго плян мае графы: назва машын, ёсьць у наяўнасьці, не хапае, вызначана да завозу, замаражана. Усе гэтыя графы запоўнены лічбамі. Але адкуль узяты гэтыя лічбы, чаму такая, а ня іншая вялічыня стаіць у графе — цяжка было адказаць прадстаўніку тав. **Анцюху**.

У пляне ёсьць яўным непаразуменьні. Так, напрыклад, не хапае граблеяў конных 61 штук, а вызначана 219, малатарняў складаных — 20, а вызначана для завозу 32, снопавязалак трактарных не хапае 52, вызначана 75. Калі запыталі ў прадстаўніка Наркамсаўгасаў тав. Анцюха: чым тлумачыцца ў пляне такая разьбежка, дык ён толькі змог адказаць: «Масква столькі вызначыла». Бачыце, там такі «ліпак», што цавязваюць упаўнаважанаму Наркамсаўгасаў БССР браць непатрэбныя ім сельгасмашыны.

Наўрад ці гэта так. Ці не зьяўляецца гэта вынікам шкодная вамашкі — «даць як мага большую заяўку, бо ўсёроўна зрэжуць»?

Некаторыя весткі аб фактычным ходзе рамонту машын сыгналізуюць аб яўным вэрыве на гэтым участку. На 1-VI плян рамонту па сыстэме Наркамсаўгасаў выканан: па сенакасілках трактарных на 20 проц., конных — 35 проц., па жнярках, снопавязалках трактарных—53 проц., конных—16 проц. Па жнярках самаскідках адрамантавана 15 проц., малатарных складаных 15 проц. і поўскладаных—20 проц. Такія-ж ганебныя лічбы па завозу і вырабу запчастак ў сыстэме Белсельгасснабу, у якога грашовы баланс яўна разыходзіцца з рэчаіснасьцю. Забясьпечанасьць галоўнымі запчасткамі на 9/VI-г. г. (сюды ўключаецца астача на складах Белсельгасснабу, завоз з заводаў СССР і выраб на прадпрыемствах мясцовай прамысловасьці) характарызуецца наступнымі лічбамі: да ўборачных машын механічнай цягі ёсьць запчастак—17,9 проц., важоў камплектных да сенакасілак—19 проц. (замест патрэбных 2000 ёсьць 380 штук), важоў да жнярак 8,4 проц (не хапае 3300 шт.). Укладышаў да малатарняў складаных няма ні аднаго, а трэба 200 штук. Трэба падкрэсьліць поўную няўвязку ва ўзаемаадносінах паміж Белмэталяб'яднаньнем—з аднаго боку і Белсельгасснабам, узаіманважаным Наркамсаўгасаў, Наркамземам—з другога боку. Мэталяб'яднаньне ў асобе дырэктара **Левіка** і яго намесьніка **Шоў** кава скарэдзіцца на тое, што яму не даюць заказаў. Наркамзем, Наркамсаўгас і Белсельгасснаб у сваю чаргу гаворыць аб тым, што іх заказы Мэталяб'яднаньне ня выконвае. І тое і другое праўда. **Але ад гэтых спрэчак уборачнай не лягчэй.**

Бязумоўна, Белмэталяб'яднаньне ня выконвае ў тэрмін тыя заказы, якія яму даны. **«Зьвязда»** неаднаразова сыгналізавала аб гэтым.

Адсутнасьць бальшавіцкай мабілізацыі рабочых і інжынэрна-тэхнічнага персаналу на базавое выкананьне пляну па вырабу запчастак—вось што характарызуе работу партыйных, прафсаюзных і гаспадарчых арганізацый у гэтых адносінах мэталяпрамысловасьці БССР. Але і тое-ж праўда, ня гледзячы на неаднаразовыя патрабаваньні з боку Мэталяб'яднаньня, Наркамзем, Наркамсаўгасаў, Белсельгасснаб і іншыя арганізацыі ня далі заказаў на неабходныя запчасткі на будучы час.

«Ні нашто не пэтэцыю да Мэталяб'яднаньня, бо ня ведаю, што паломіцца, што атрымаю з Масквы і г. д.» —так сьпяляе прадстаўнік Белсельгасснабу тав. Гладкін.

Поўны самацёк у рабоце. Што «са столі зваліцца», то ў пляне заліпацца.

Белмэталяб'яднаньне дало ўжо заводам плян на трэці квартал, а выраб запчастак ня ўлічан, бо невядома, колькі і чаго трэба. Ёсьць зусім выразныя пастановы партыі і ўраду аб тым, каб прыстасаваць завод «**Чырвоны барэц**» (Ворша) да вырабу запчастак да трактараў. Белмэталяб'яднаньне пакуль што нічога ня робіць у ажыцьцяўленьні гэтай пастановы, бо невядома колькасьць і якасьць тэй прадукцыі, якую завод будзе даваць сельгасмашынам, а значыцца невяцом характар і магутнасьць патрэбнага абсталяваньня.

Усе гэтыя факты гавораць аб тым, што падрыхтоўка ўборачных машын знаходзіцца пад яўнай пагрозай зрыву.

Партыйныя і савецкія арганізацыі ня ўлічылі ўрокаў мінулага і не забясьпечылі бальшавіцкай мабілізацыі мас на баявую падрыхтоўку да ўборачнай кампаніі. Такое становішча зусім нецярпіма.

Неадкладная задача Наркамзему, Наркамсаўгасаў з іх трэстамі, Белсельгасснабу—карэнным чынам перабудаваць сваю работу. Яны павінны паслаць на пізы сваіх работнікаў, арганізаваць там поўнае выяўленьне машын, якія патрабуюць і якога рамонту, склады іх эфэктыўнай ведамасьці, спэцыфікацыі на запчасткі. Трэба праверыць наяўнасьць на складах сельгасмашыны, запчастак, каб запраўды вы

Пазыка Другой пяцігодкі

Плян выканан на 90 проц.

У бліжэйшыя дні даць усе 100—справа гонару БССР

АБ ХОДЗЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ У БССР

Пастанова Калегіі Народнага Камісарыяту Фінансаў БССР і Цэнтральнай Камісіі Садзейнасьці ашчадсправе і дзяржкредыту пры прэзыдыуме ЦВК БССР

Пад выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з вялікім правадыром тав. **Сталіным** пры вялізарным энтузіязме і творчым уздыме з боку шырокіх працоўных мас БССР дасягнула вялізарных посьпехаў у рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі як у горадзе, так і на вёсцы — сярод калгаснага сялянства.

Дзякуючы баявой ударнай рабоце арганізацыі БССР за 26 дзён пасьля выпуску дэкрэту ўраду аб пазыцы рэалізавалі пазыку другой пяцігодкі на 59.210 тыс. руб., выканаўшы заданьне па горадзе на 105 проц. і па калгасах — па 121 проц.

Ня толькі горад, але і калгасная вёска разгарнулі баявую ударную бальшавіцкую работу, далёка апярэдзіўшы тэмпы леташняй пазыковай кампаніі. Гэтыя дасягненьні ёсьць вялікая дэманстрацыя энтузіязму, волі, арганізаванасьці і адданасьці бальшавіцкай барацьбе ў другую пяцігодку — пяцігодку пабудовы сацыялістычнага грамадзтва — з боку фізічных, калгаснікаў і ўсіх працоўных мас нашай краіны і глыбокага даверу да партыі Леніна, яе генэральнай лініі.

Народны Камісарыят Фінансаў і Цэнтральная Камісія Садзейнасьці ст. здавальненьнем адзначаюць вялізарнейшыя посьпехі, якіх дабіліся на працягу кароткага тэрміну буйнейшыя пралетарскія цэнтры БССР: **Менск, Гомель, Віцебск** і раёны — **Жыткавіцкі, Вузьдзенскі, Заслаўскі, Дзяржынскі, Старобінскі, Аршанскі, Слуцкі, Клімавіцкі, Касьцюковіцкі** і сьледам за імі — **Рагачоўскі і Сеньненскі,** выканаўшыя і перавыканаўшыя заданьне па рэалізацыі пазыкі.

Асабліва трэба адзначыць праведзеную ударную работу наступных буйных прадпрыемстваў, а таксама ў сельсаветах, выканаўшых заданьне па аднаасобным сэктары за наяўны разрахунак, і калгасах, датэрмінова ўнесшых цалкам сродкі па падпісцы, якія скончылі рэалізацыю пазыкі на працягу 1-2 дзён:

а) **па Менску** — Завод **Верашылава**, гарбарня **«Бальшавік»**, завод **«Камунар»**, абутковая ф-ка імя **Кагановіча**, фабрыка **«Камунарка»**, швэйная **«Настрычнік»;**

б) **па Віцебску** — швэйная фабрыка **«Прафінтэрн»**, акулярная ф-ка і панчошная імя **Клары Цэткін;**

в) **па Гомелі** — завод імя **Ланцуцкага, Гомсельмаш;**

г) **па Барысаве** — фабрыка **«Чырвоная бярэзіна»**, друкарня імя **1-га мая;**

д) **па Рагачоўскім раёне** — Запольскі сельсавет, выканаўшы заданьне па аднаасобным сэктары за наяўны разрахунак на 100,8 проц. (заданьне 16 тысяч, рэалізавана на 16.200 р.);

ж) **па Барысаўскім і Магілеўскім раёнах** — калгас **«Чырвоны бяцец»** і **«Камінтэрн»**, датэрмінова ўнёсшыя цалкам грошы па падпісцы.

Разам з гэтым Народны Камісарыят Фінансаў і Цэнтральная Камісія Садзейнасьці адзначаюць недапушчальнае адставаньне па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі наступных буйных раёнаў: **Мазырскі** (87 проц.), **Рэчыцкі** (73,4 проц.), **Бабруйскі** (90,2 проц.), **Барысаўскі** (88,4 проц.), а таксама яшчэ некаторых раёнаў БССР, **асабліва: Бешанковіцкага** (43,5 процантаў), **Клічаўскага** (54,5 проц.), **Уваравіцкага** (56,9 проц.), **Сураскага** (55,2 проц.), **Кармянскага** (56,1 проц.), **Чырвонапольскага** (56 проц.), **Талачынскага** (62,4 проц.), **Нараўлянскага** (58,9 проц.), **Церахаўскага** (57,9 проц.), **Сіроцінскага** (65,1 проц.), **Бялыніцкага** (66,5 проц.) і іншых.

Гэтае адставаньне раду гарадоў і раёнаў не дазволіла БССР па-ўдарнаму скончыць падпіску разам з перадавымі рэспублікамі і абласьцямі СССР.

БССР на 10 чэрвеня выканала заданьне на 90 проц.

Выходзячы з вышэйпаказанага, Народны Камісарыят Фінансаў і Цэнтральная камісія садзейнасьці дзяржкредыту і ашчадсправе **пастанаўляюць:**

1. Абавязаць кіраўнікоў і актыў усяго фінансава-ашчаднага апарату і камсоставу як перадавых, так і ў асабліваснці адстаючых раёнаў разгортваць далей кампанію па рэалізацыі пазыкі другой пяцігодкі ўдарнымі тэмпамі да поўнага, стопроцантнага ахопу падпіскай усіх працоўных гораду і вёскі, шырока мабілізаваўшы грамадзкасьць на аснове далейшага разгортваньня агітмасавай растлумачальнай работы.

2. Паставіць у якасьці бліжэйшай задачы ў справе рэалізацыі пазыкі перад усімі фінорганамі, ашчадкасамі, камсодамі рашучае ўзмацненьне тэмпаў работы па рэалізацыі пазыкі за наяўны разрахунак сярод працоўных аднаасобнікаў, сэзонных рабочых і неарганізаванага гараджога насельніцтва, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на разгортваньне масава-палітычнай работы, арганізаваўшы шырокую шэфскую, сацыялістычную дапамогу з боку перадавых камсодаў прадпрыемстваў, саўгасаў, МТС і калгасаў адстаючым сельсаветам, вёскам і селькамсодам.

3. Побач з хутчэйшым завяршэньнем пазыковай кампаніі Народны Камісарыят Фінансаў і ЦКамсод ставяць асноўнай задачай перад усімі фінорганамі, ашчадкасамі, камсодамі —вядзеньне далейшай барацьбы за паляпшэньне абслугоўваньня працоўных пазыкатрымальнікаў на падставе мэтадаў і вопыту, атрыманых у часе праведзеньня дня пазыкатрымальніка (выяўленьне і выплата выйгрышаў і процантаў, раздача аблігацый ранейшых масавых пазык) і забесьпячэньне своячасовага і поўнага паступленьня ў бюджэт сродкаў ад пазыкі і выразнай пастаноўкі ўліку.

4. Народны Камісарыят Фінансаў і Цэнтральная Камісія Садзейнасьці заклікаюць усе прафсаюзныя, камсамольскія арганізацыі, друк, добраахвотныя таварыствы, саветы і ўдарнікаў фінансавага фронту па-бальшавіцку змагацца за завяршэньне пазыкавай кампаніі ў бліжэйшыя дні, разгарнуць масава-палітычную работу вакол новай пазыкі і перадаць лепшыя прыклады і ўзоры масавай работы адстаючым.

Народны камісар фінансаў БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

Старшыня цэнтральнай камісіі садзейнасьці дзяржкрэдыту і ашчадсправе пры прэзыдыуме ЦВК БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

12 чэрвеня 1933 г. г. Менск.

Рагачоўскі раён выканаў фінплян другога кварталу

ЦК КП(б)Б — ТАВ. ГІКАЛО, ЦВК БССР — ТАВ. ЧАРВЯКОВУ, СНК — ТАВ. ГАЛАДЗЕДУ, НАРКАМФІНУ — ТАВ. ХАЦКЕВІЧУ, ЦО — ГАЗ. «ЗЬВЯЗДА»

РАПАРТ

Пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі Рагачоўскі раён плян мабілізацыі сродкаў II кварталу выканаў на 100,9 ПРОЦ., у тым ліку па добраахвотных плацяжох — на 154,1 проц.

Мабілізуем усю сілу на сканчэньне рэалізацыі пазыкі па аднаасобным сэктары.

БЯРЭМ НА БУКСІР ЖЛОБІНСКІ РАЁН.

Сакратар райкому КП(б)Б ГЭЎРАСЕЎ.
Старшыня РВК МАЦЬКО.
Заг. райфа НІСЬНЕВІЧ.



У ДЗЕНЬ ДЗЕСЯЦІГОДЗЬДЗЯ ФІЗКУЛЬТУРНАГА РУХУ У БССР.

Рэкорд цеганіны

У сьнежні 1932 году рэдакцыяй газэты «Зьвязда» ў Крупскую РКК-РСІ быў накіраван ліст тэхніка Крупскага леспрамгасу тав. **Дорзіка** аб тым, што Ўхвальскі сельсавет незаконна сабраў у яго 10 пудоў жытняй мукі.

Пасьля некалькіх напамінаньняў рэдакцыя дабілася ад РКК-РСІ 27 лютага 1933 году (праз два месяцы) адказ за подпісам заг. бюро скаргаў тав. Фядоткі, дзе ўказана: «скарга Дорзіка праверана і прапанавана райпракурору прыцягнуць вінаватых у цеганіне і незаконных дзеяньнях да крымінальнай адказнасьці».

Здавалася-б, што работнікі Крупскай РКК-РСІ справу ўзварушылі і мы былі ўпэўнены, што давядуць яе да канца. Прайшло больш 2-х тыдняў, вынікаў ня відаць. Тады «Зьвязда» 16 сакавіка надрукавала ліст Дорзіка пад назвай «8 месяцаў цеганіны» (№ 59, ад 16 сакавіка 1933 году).

У надрукаваным лісьце пісаліся прозьвішчы валакітчыкаў і парушальнікаў закону. У гэтым-жа лісьце «Зьвязда» патрабавала ад Крупскай РКК-РСІ тэрміновага рэагаваньня. Пасьля гэтага Крупская РКК-РСІ і пракуратура нібы зноў заварушыліся, зноў пачалі пісаць паперкі аб незаконным дзеяньні Ўхвальскага сельсавету ў адносінах тав. Дорзіка, аб звароце яму 10 пудоў мукі і г. д.

Але далей пісаніны, далей нуда бюракратычнай цеганіны справа не пасунулася, 10 пудоў мукі Дорзіку ня вернуты і вінаватыя да адказнасьці ня прыцягнуты.

Рэдакцыя настойліва патрабуе неадкладна прыняць меры па гэтым лісьце і паведаміць нам аб выніках.

Выкарчаваць бюракратызм у Белкаапсаюзе

(Ліст камандзіра запасу)

У 1918 годзе я добраахвотна паступіў у Чырвоную гвардыю і прымаў удзел у грамадзянскай вайне. Да паступленьня ў армію жыцьцё маё працякала ў вельмі цяжкіх умовах. Маці працавала на скотным дваре ў пашешчыка і мне з 12 год прыйшлося ісьці на службу да вясковых багацеяў.

У Чырвонай арміі я прабыў да 1933 году. Пасьля дэмабілізацыі паступіў на работу ў адміністрацыйна-гаспадарчы аддзел Белкаапсаюзу. Але невядома чаму быў хутка зволены. Прыйшлося зьвярнуцца за дапамогай у Менаддзел працы, які аднавіў мяне на рабоце.

Тады Белкаапсаюз, матывуючы тым, што пасада, якую я займаў не зацьверджана па штаце, перавёў мяне ў сельска-гаспадарчы сэктар для пасылкі ў прыгарадную гаспадарку. Але гэта быў толькі своеасаблівы манэўр для таго, каб зусім выжыць мяне з установы. У прыгарадную гаспадарку мяне не паслалі, а на старое месца замест мяне ўзялі другога чалавека. Зразумела, што ўсе гэтыя разважаньні аб незагружанасьці і незацьверджанасьці пасады патрэбны былі толькі для таго, каб замяніць мяне другім чалавекам.

У выніку я з 5 мая застаўся без работы. На маім утрыманьні тры чалавекі. Некалькі разоў я зварачаўся да адміністрацыі і прафкому Белкаапсаюзу, але бескарысна. Зьвярнуўся ў Менаддзелпрацы—таксама не дапамагло. Інспэктар працы Левін накіраваў маю справу ў працэсацыю і на гэтым канец.

Дубякоў.

АД РЭДАКЦЫІ: «Зьвязда» просіць МентарКК РСІ тэрмінова расьсьледаваць названыя факты і за яўна бюракратычныя ўчынкі над тав. Дубяком вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Талачынская МТС ігнаруе грамадзкае харчаваньне

(Ліст рабочых МТС)

Усім вядомы зусім выразныя дырэктывы нашай партыі і ўраду аб узьнаўленьні на патрэбную вышыню грамадзкага харчаваньня, асабліва калі гутарка ідзе аб такой арганізацыі, як МТС — важнейшае зьвяно веснавой сяўбы, — усё-ж трыкутнік Талачынскай МТС гэтых дырэктыў зразумець ня хоча.

Рабочыя і служачыя МТС ужо ня раз пісалі у насьценгазэту аб бязьдзейнасьці сталоўкі, аб антысанітарыі ў ёй, няпрэвільнай выдачы хлеба, недапушчальна дрэннай якасьці абедаў, аб сямейнасьці, разбазарваньні прадуктаў і г. д.

Аб усіх недапушчальна дрэнных зьявінчах у сталоўцы добра ведаюць: дырэктар МТС Суканаў, сакратар партячэйкі **Ткачук,** старшыня рабочкому **Картулава,** але іх гэта не датычыць, яны «заняты» іншымі справамі.

Мы зварачаемся да «Зьвязды» за дапамогай.

Сьледуе 6 подпісаў.

Цнянскі торфазавод патрабуе аздараўленьня

За 16 кілёмэтраў ад Менску знаходзіцца вялікія Цнянскія балоты, багатыя вялікімі масывамі торфу.

На гэтых балотах раскінуўся і заняў вялікі прастор **Цнянскі** торфазавод, які забясьпечвае сваёй прадукцыяй электрычную станцыю— сэрца пралетарскай сталіцы БССР—Менску.

Тут працуе каля 700 рабочых; яны разьбіты па брыгадах і арцелях, якія прымацаваны да асобных машын і вучасткаў.

Тарфяны сэзон пачаўся 15 мая. Па маштыкаму торфу заводу дана норма ў 231.500 штук цаглін за дзень у дзьве зьмены.

Але выкананьне гэтага штодзеннага заданьня са дня на дзень зрываецца на 50 процантаў, а часамі і значна больш.

Брыгада **Бізнэсікава** ў складзе 29 чалавек замест 34.000 штук цаглін торфу ў дзень выробліе ўсяго 22.700 штук, з якіх значная частка браку.

Амаль ні адна рабочая брыгада ня выконвае свайго дзеннага заданьня.

Такое становішча тлумачыцца перш за ўсё ўраўнілаўкай у аплаце рабочай сілы. Брыгады працуюць па-старынцы, падзённа, што не стымулюе рабочых на поўнае выкананьне і перавыкананьне сваіх дзённых заданьняў.

Адміністрацыя і торфком ня ўлічылі гэтага і не перавялі рабочых з перших-жа дзён торфэзону на зьдзельную аплату працы.

Сацыялістычнае спаборніцтва паміж рабочымі торфзаводу не разгорнута. Паміж брыгадамі не заключаны сацдагаворы.

Сярод наяўных 230 рабочых і работніц мардвінскай нацыянальнасьці не праводзіцца ніякай растлумачальнай работы аб сутнасьці сацыялістычнага спаборніцтва, аб значэньні ўдарніцтва, аб новых мэтадах сацыялістычнай працы і г. д.

Культмасавая работа на заводзе пастаўлена зусім дрэнна, для 700 рабочых няма ні клюбу, ні ленкутка. Сакратар партыйнай ячэйкі тав. Марголін заяўляе:

— На што нам грошы траціць, абыйдземся і так.

На заводзе на май месяц ня было выпісана ні аднаго экзэмпляра газэт і журналаў, няма радыё.

— Мы адарваны ад жыцьця,—гаворыць рабочыя заводу.

Рабочы-тарфянік пасьля працоўнага дня ня можа знайсьці сабе культурнага і карыснага адпачынку.

Ня гледзячы на тое, што на заводзе 200 рабочых няпісьменныя, ні адна арганізацыя не зацікавілася пытаньнем ліквідацыі няпісьменнасьці сярод рабочых.

Прыклад таго, як ня трэба праводзіць падпіскі на «пазыку другой пяцігодкі», паказвае торфзавод «Піна». Тут не праводзілася ніякай масавай хаваўчай і растлумачальнай работы сярод рабочых. Супнасьць выпускаемай пазыкі, яе значэньне, купы і на што ідуць сродкі ад пазыкі—аб гэтым не гаварылі кіруючыя арганізацыі заводзкім рабочым торфзаводу «Піна».

Насьценная газэта, замест таго, каб мабілізаваць увагу рабочых па падпіску на «пазыку другой пяцігодкі», не зьмясьціла ніводнага допісу аб пазыцы.

Такая пастаноўка пытаньня аб падпісцы на пазыку гаворыць за тое, што кіраўнікі торфзаводу «Піна» не ўсвядомілі сабе палітычнай важнасьці і не ўзначалілі барацьбы за пасьпяховую рэалізацыю пазыкі сярод рабочых.

Справа забесьпячэньня каапэрацыі таварамі і сталовай прадуктамі знаходзіцца зусім у агідным становішчы. Тут віна 2 арганізацый: торфрабкопу і Эльводу. Іван кідае на Пятра, а Пятро на Івана, а справа з нармальным забесьпячэньнем рабочых стаіць на мёртвым пункце.

Заводзкія арганізацыі не вядуць бальшавіцкай барацьбы за ўмацаваньне працоўнай дысцыпліны, не даюць жорсткага адпору клясаваму ворагу і яго агентам.

Ёсьць цэлы рад простых злачынстваў. Напрыклад, было выкрыта шкодніцтва з боку падмулачніка «работага» **Пашэка,** які паламаў поршневыя кольцы торфмашыны, у выніку чаго машына прастаяла доўгі час у рамонце. На гэтым факце ня была завострана ўвага рабочага калектыву і Пашэк беспакарана застаўся працаваць.

Ёсьць асобныя дэзарганізатары працы, якія патражаюць нявыхадам на работу. Да іх ня прымаецца ніякіх мер.

Партыйная ячэйка на чале з сакратаром тав. **Марголіным** і торфком на чале з тав. **Пятроўскім** не мабілізуюць рабочых на выкананьне штодзённых плянаў здабычы торфу.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі электрастанцыі павінны зараз-жа дапамагчы выправіць усе хібы торфзаводу, які дае ёй «памучны хлеб», каб выканаць плян торфздабычы.

Цнянскія торфарасрацоўкі могуць бесьперабойна і поўнасьцю забясьпечваць сваёй прадукцыяй работу электрастанцыі.

С. Ш.

Шапілаў-Майскі і Бік

ЯК НЕЛЬГА КІРАВАЦЬ ГАНДЛЕМ

Першы этап усебеларускага конкурсу сельспажыўтаварыстваў у асноўным скончан. Конкурс зараз уступае ў самы адказны пэрыяд барацьбы за высокі ўраджай, у этап арганізацыі абслугоўваньня праполачных і ўборачных работ.

Зараз, калі спажывецкая каапэрацыя прыступае да ажыцьцяўленьня новай сур'ёзнай задачы, пастаўленай перад ёю, вельмі важна падрабязна ахарактарызаваць тыя заслоны, тыя тормазы, якія стаяць на шляху сапраўднай перабудовы работы сыстэмы спажывецкай каапэрацыі, з тым, каб іх зьнішчыць на-хаду і па-ўдарнаму абслужыць праполачна - ўборачную кампанію.

***

Вялікая адказнасьць за разгортваньне таваразвароту, за ажыцьцяўленьне таварнай змычкі паміж горадам і вёскай ускладзена на **гандлёвае кіраўніцтва Белкаапсаюзу.** У радзе канкрэтных і зусім ясных дырэктыў партыі і ўраду вызначаны тыя мерапрыемствы, якія павінны быць праведзены ў мэтах пасьпяховага разгортваньня таваразвароту.

Партыя патрабавала ад спажывецкай сыстэмы (гэта асабліва адносіцца да гандлёвага кіраўніцтва БКС) — **гібка манэўраваць таварнымі фондамі, ліквідаваць абязьлічку, арганізаваць барацьбу за якасьць, асартымэнт, цану, укараніць прынцып папярэдніх заказаў, разгарнуць савецкі культурны гандаль і ліквідаваць выпадкі замарожваньня таваразвароту** і г. д. Гандлёвае кіраўніцтва БКС павінна было будаваць сваю работу на аснове ажыцьцяўленьня гэтых дырэктыў партыі і ўраду.

«Зьвязда» ўжо сьчэрвала аб вялікіх недахопах у рабоце гандлёвага кіраўніцтва Белкаапсаюзу. Трэба сказаць, што кіраўніцтва ўсё-ж умудрылася ўтаіць ад грамадзкасьці рад сур'ёзьнейшых і агіднейшых прабелаў у сваёй дзейнасьці. Яно не зрабіла дакладных вывадаў з канкрэтных пастаноў партыі і ўраду па пытаньнях таваразвароту, ня ўлічыла сыгналаў грамадзкасьці.

Белкаапсаюз па працягу некалькіх год сыстэматычна рэарганізоўваў і перабудоўваў кіраўніцтва таваразваротам, але ўся бяда ў тым, што гэта рэарганізацыя ператварылася ў пустую фармальнасьць, у звычайную зьмену шыльды.

Як-жа выглядае профіль некалькі раз перафарбаванага гандлёвага кіраўніцтва? Па-першае, уся яго работа будуецца на **габінэтна-вузкім плянавальні завозу тавараў** і папяровым кіраўніцтве таваразваротам. Гандлёвае кіраўніцтва апэрацыйную, канкрэтную, жывую работу падмяніла габінэтным цыркулярным камандаваньнем. Пляны завозу тавараў у раёны складаліся не на аснове вывучэньня попыту таго ці іншага раёну, папярэдніх заказаў самой сыстэмы, а будаваліся па мэтаду «як левая нага захоча». Адсюль поўная безадказнасьць ў рабоце Гандлёвага кіраўніцтва. Хаця штат яго пабудован па прынцыпу адказных выканаўцаў, але ні адзін з іх ня ведае, за што ён нясе адказнасьць.

Для таго, каб даць яснае ўяўленьне аб мэтадах кіраўніцтва таваразваротам, для таго, каб паказаць, як Гандлёвае кіраўніцтва справілася са сваімі абавязкамі, паламо рад фактаў работы міжраённых баз і нізавой спажывецкай сыстэмы.

Міжраённыя базы закліканы адыграць вялікую ролю ў павялічэньні завозу тавараў, у разгортваньні паваляннавых закупак, у арганізацыі гандлю па нізоўцы. Адным, гэтыя базы ня справіліся са сваімі задачамі.

Да міжраённых баз прымацаваны ССТ і райсаюзы. Базы, як арганізатары савецкага гандлю, павінны былі кіраваць гандлёвай работай ССТ і райсаюзаў, вывучаць попыт нізоўкі, пасьтрэбны асартымэнт, вучыць адпачатсова нізавую сетку, як трэба прасоўваць тавары, як прадаваць іх, як будаваць завоз, як змагацца за якасьць, цану і, нарэшце, як будаваць

Адкрыцьце лёнданскай эканамічнай канфэрэнцыі

Міжнародныя даўгі—галоўная тэма

ЛЁНДАН, 12. (ТАСС). Сусьветная эканамічная канфэрэнцыя была адкрыта прамовай ангельскага караля. У сваёй прамове кароль, як перадае агэнцтва «Рэйтар», заявіў:

«Сьвет у неспакойным становішчы і перад вамі, пачынаючымі работу па адбудаваньні міру, цяжкая задача. Гэта задача можа быць вырашана толькі пры добрай волі і сапраўдным супрацоўніцтве. Усе краіны церпяць ад агульнага зла. Аб гэтым сьведчыць вельмі ясна ўзрост колькасьці беспрацоўных. Перад тварам крызісу, існаваньне якога прызнаюць усе, я заклікаю вас да супрацоўніцтва ў імя неабходнага міру».

Пасьля прамовы караля выступіў МАКДАНАЛЬД, які значную частку свае прамовы прысьвяціў крызісу. Закранаўшы праблему даўгоў, ён катэгарычна заявіў, што ГЭТАЕ ПЫТАНЬНЕ, ЯКОЕ НЯ ЎКЛЮЧАНА Ў АДВЕСТКУ ДНЯ, ПАВІННА БЫЦЬ ВЫРАШАНА ЯШЧЭ ДА ТАГО, ЯК БУДУЦЬ АДХІЛЕНЫ ЎСЯКІЯ ІНШЫЯ ПЕРАШКОДЫ ДА ЎСЕАГУЛЬНАГА АДНАЎЛЕНЬНЯ ГАСПАДАРКІ.

Канфэрэнцыя выбрала бюро, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі 16 дзяржаў, у тым ліку СССР. Наступнае пасяджэньне адбудзецца 13 чэрвеня.

***

Калі ня лічыць прамовы караля, канфэрэнцыя адкрылася з захаваньнем жэнэўскага рытуалу, які ўжо даў па ўсім пабіў аскоміну. Прамова Макдональда выклікала некаторую сэнсацыю, асабліва ў той частцы, дзе ён гаварыў аб значэньні міжнародных даўгоў для справы адхіленьня ўсіх іншых труднасьцей, якую капіталістычны сьвет зьбіраецца вырашыць у Лёндане. Прысутным па канфэрэнцыі амэрыканцам успомін аб даўгох — гэтым забароненым пытаньні — быў поўнай нечаканасьцю. Гэтае выступленьне Макдональда зьявілася для іх амаль што парушэньнем «сумленнай игры». «Гэта выступленьне, заяўляюць амэрыканцы, наказвае на тое, што Англія так ці інакш працягне на канфэрэнцыі гэтае злашчаснае пытаньне, хоць бы кантрабандным шляхам».

Можна з упэўненасьцю сказаць, што выступленьне Макдональда ў частцы, якая закранае даўгі, было непасрэдна - прадыктаваным сёпешнім новым рэзкім зьніжэньнем курсу даляра. Такім чынам, **абодвы бакі ў першы-жа момант выклалі на стол свае карты**, і ня гледзячы на захаваньне знадворных форм прыстойнасьці, **пачалі бой.** Што-ж датычыцца выбранага бюро канфэрэнцыі, то не падлягае сумненьню, што галоўная работа эканамічнай канфэрэнцыі будзе праходзіць у гэтым бюро, якое па сваім характары павінна зьяўляцца тым, чым па канфэрэнцыі па разбраеньні зьяўляецца генэральная камісія. Аднак, таксама ясна і тое, што рашаючыя перагаворы будуць праходзіць у прыватных спатканьнях прадстаўнікоў паасобных груповак. Гэтыя прыватныя перагаворы пачаліся яшчэ да афіцыяльнага пачатку канфэрэнцыі і цяпер ідуць узмоцненым тэмпам.

„Я не ўскладаю вялікіх надзей на вынік" канфэрэнцыі"

Заява тав. Літвінава

ЛЁНДАН, 12. (ТАСС). Агэнцтва «Рэйтар» паведамляе: «У гутарцы з прадстаўніком агэнцтва «Рэйтар» Нарком замежных спраў СССР т. **Літвінаў** заявіў, што ён не належыць да ліку дэлегатаў, якія настроены аптымістычна. Паводле яго слоў, ён прыехаў хутчэй вучыцца, чым вучыць. Ён мяркуе аднак, што зможа высунуць некаторыя канкрэтныя прапановы. Літвінаў не ўскладае вялікіх надзей на вынікі канфэрэнцыі з прычыны таго, што за апошнія гады было шмат міжнародных канфэрэнцый, адкрыцьцё якіх суправаджалася такімі-ж пічырымі заявамі аб добрай волі, але якія давалі адмоўныя, і нават катастрафічныя вынікі».

Напружанае становішча ў Аўстрыі

Сутычкі нац.-сацыялістаў з хэймвэраўцамі

ВЕНА, 13. (ТАСС). Палітычнае становішча ў **Аўстрыі** робіцца ўсё больш напружаным. 12 чэрвеня ў розных частках **Вены,** у тым ліку і каля парляманту, узарвалася некалькі бомб. Услед за ўзрывам бомб вялікі натоўп нацыянал-сацыялістаў, галоўным чынам, студэнтаў прабаваў прарвацца ў будынак парляманту і венскага муніцыпалітэту. Дэманстранты былі разагнаны атрадамі жандараў. Будынкі парляманту і муніцыпалітэту заняты ўзмоцненымі паліцэйскімі пастамі. Па Рынгу (галоўнае кальцо Вены) раз'язджалі конныя патрулі. У кавярні, якая злучаецца з будынкам таварнай біржы, выкрыта пікельная машына, якая толькі выпадкова не ўзарвалася.

Увечары 12 чэрвеня паліцыя заняла будынак «Карычневага дому» (памяшканьне нац-сацыялісцкай партыі) у Вене, а таксама памяшканьне ўсіх яго раённых аддзелаў. Распушчан таксама нацыянал-сацыялісцкі «Салдацкі саюз». У сувязі з узмацненьнем актыўнасьці нацыянал - сацыялістаў хэймвэраўскі друк праводзіць кампанію за неадкладную забарону нацыянал-сацыялісцкай партыі.

Побач з дэманстрацыямі нацыянал-сацыялістаў у Вене 12 чэрвеня адбываліся бурныя дэманстрацыі студэнтаў нацыянал-сацыялістаў у **Грацы.** Па ўсёй Аўстрыі адбываліся сутычкі паміж нацыянал-сацыялістамі і хэймвэраўцамі. У палітычных колах Аўстрыі расцэньваюць узмоцненую дзейнасьць нац-сацыялістаў, як частку адзінага пляну скапцэнтраванага наступленьня, які распрацавалі нацыянал-сацыялісты. «З прычыны ўсё большага абвастрэньня палітычнага становішча канцлер **Дольфус,** як піша афіцыёзная «Рэйхспост», вернецца з эканамічнай канфэрэнцыі ў Лёндане раней вызначанага тэрміну».

Замежная хроніка

*) Уздым вады на рэчцы Янцзы ў правінцыі Хубэй (Кітай) дасягнуў амаль што ўзроўню 1931 году, што пагражае паўтарэньнем паводкі. Ва ўсходняй частцы правінцыі Хубэй вада разбурыла плаціну і заліла сотні тысяч гектараў зямлі.

★ У сувязі з замахам на кіраўніка тырольскай (Аўстрыя) хэймвэры **Штэйдле** і на старшыню штырыйскага ўраду **Рынтэлена,** «Рэйхспорст» выкрывае палітычны характар абодвых тэрарыстычных актаў. Газэта адначае, падабенства ў абставінах паміж замахамі на Штэйдлеі і нядаўнім забойствам Бэла.

„Кірмаш плётак і бескарысных прамоў"

ФРАНЦУСКІ ДРУК АБ ЛЕНДАНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

ПАРЫЖ, 13. (БЕЛТА). Французкі друк усімі спосабамі зьмяншае значэньне сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі. **«Пары Суар»** піша: «У сапраўднасьці лёнданская канфэрэнцыя становіць сабою кірмаш і, як на ўсякім кірмашы, тут абменьваюцца мноствам плётак і бескарысных прамоў —цікавых ці недарэчных. У Таўханіне афармляюцца розныя плыні, якімі будуць карыстацца буйныя спэцыялісты па манэўрах».

Сэн Брыс у **«Журналь»,** апісваючы знадворны выгляд пленуму канфэрэнцыі, заўважае, што крыху падобна на пахаваньне, калі-б толькі гэта магло быць пахаваньне глупства.

«Волёнтэ» піша: «Можна разрозьніваць тры этапы ў гісторыі ўсіх пасьляваенных канфэрэнцый: у першым этапе зьбіраліся з вялікімі надзеямі і разыходзіліся з такімі—сякімі «эвультатамі; у другім этапе былі надзеі і вялікія расчараваньні; цяпер жа ідуць на лёнданскую канфэрэнцыю з найвялікшым страхам, пры чым кожны баіцца быць абдураным і максымальна магчымую згоду бачаць ва ўпікненьні ўсеагульнай бойкі».

«Тан» ускладае адказнасьць за магчымы правал канфэрэнцыі на ПАЗШ. Ня будзе перапавялічэньнем сказаць, піша «ТАН», што лёс канфэрэнцыі знаходзіцца ў руках амэрыканцаў. Апошнія могуць забясьпечыць яе посьпех шляхам урэгуляваньня пытаньня аб міжсаюзных даўгох і аднаўленьні валютнай стабільнасьці. Калі яны не захочуць вырашыць гэтыя асноўныя праблемы, дык тым самым яны прывядуць да банкрутства самую сур'ёзную спробу палітычнага і эканамічнага аднаўленьня сьвету, якая калі небудзь рабілася да гэтага часу.

Камуністычная дэманстрацыя на эканамічнай канфэрэнцыі

ЛЁНДАН, 13. (БЕЛТА). Зараз-жа пасьля таго як кароль пакінуў памяшканьне эканамічнай канфэрэнцыі, КАМУНІСТЫ ПРАВЯЛІ ДЭМАНСТРАЦЫЮ НА ВАЧОХ У ПЛЕНУМУ КАНФЭРЭНЦЫІ з антыфашысцкімі лёзунгамі.

За кулісамі афіцыяльных прамоў

БЭРЛІН, 13. (БЕЛТА). Паведамляюць, што ў Лёндане, яшчэ да пачатку эканамічнай канфэрэнцыі, пачаліся сакрэтныя перагаворы паміж кіраўнікамі эмісійных банкаў Англіі, ПАЗШ і Францыі аб валютным перамір'і.

Германія патрабуе калёніі

БЭРЛІН, 12. (БЕЛТА). У **Франкфурце на-Майне** закончыўся зьезд ка лёніяльных арганізацый Германіі. Зьездам створан усегерманскі калёніяльны саюз. Намесьнік Баварыі генэрал **ЭПП,** закрываючы зьезд, заявіў: «Заграніца хоча угаварыць нас, што нам не патрэбны калёніі. Наперакор гэтым чужым галасам трэба катэгарычна падкрэсьліць, што Германія пачала думаць уласнай галавой. Германія ня можа існаваць без калёній».

Паведамленьне ТАСС

Савецкі ўрад прызначыў упаўнаважанымі для вядзеньня ў Токіё перагавораў аб КУЧ паўнамоцнага прадстаўніка СССР ў Японіі т. К. К. **Юрэнева,** загадчыка Далёка-ўсходнім аддзелам Наркамату замежных спраў тав. **Б. І. Казлоўскага** і нам. старшыні праўленьня КУЧ тав. **С. М. Кузьняцова.**

Японцы фартыфікуюць праход ў Вялікай сьцяне

ШАНХАЙ, 13. (БЕЛТА). Паводле слоў кітайскіх газэт японцы рашылі зрабіць умацаваньні каля праходаў Вялікай Сьцяны **Губейкоў, Ленкоў, Сыфінкоў, Цзевінкоў, Цзюмінкоў,** а таксама каля **Шанхайгуаню.** Праходы будуць фортыфікаваны і ўзброены цяжкой артылерыяй. Практычна гэта прывядзе да ўмацаваньня ўсёй граніцы Манчжоу-Го в Паўночнага Кітаю і, па думцы газэты, зробіць зусім немагчымым доступ у Манчжоу-Го.

Суд над камуністамі ў Данцыгу

11 чэрвеня ў ДАНЦЫГУ распачаўся суд над 21 камуністамі, якія былі арыштаваны перад выбарамі ў фолькстаг (парлямант). Сярод абвінавачаных былы камдэпутат фолькстагу ПЛЕНІКОЎСКІ.

Падсудных абвінавачваюць у крадзяжы рэвальвэраў з фабрыкі зброі «ДЫЯНА». «Данцыгскія адвакаты, як піша «ГАЗЭТА ПОЛЬСКА», адмовіліся ад абароны падсудных».

Гэты працэс выклікаў вялікае абурэньне сярод данцыгскіх рабочых. Кам партыя Данцыгу выдала адозву, у якой заклікае працоўных вольнага гораду да актыўных выступленьняў супроць фашызму, за вызваленьне арыштаваных. (УЛАСН. ІНФАРМ.).

Замахі на палітычных дзеячоў Аўстрыі

ВЕНА, 13. (БЕЛТА). У **Інсбруку** зроблен замах на правадыра тырольскага хэймвэру **Штэйдле.** Штэйдле паранен у руку. Каля **Пэрнога** (Штырыя) перад праездам аўтамабілю стар шыні штырыйскага ўраду **Рынтэлена** узарваліся дзьве бомбы. Думаюць, што абодвы замахі зроблены нацыянал-сацыялістамі. Паліцыя ў **Інсбруку** заняла «Карычневы Дом» (будынак мясцовага камітэту нацыянал-сацыялістаў). Шмат нацыянал-сацыялістаў арыштавана. Правадыр Аўстрыйскага хэймвэру **Штарэнберг** па параде ў Крэмсэ рэзка выступіў супроць нацыянал-сацыялістаў і аса біста супроць Гітлера. Штэрэнберг пагражаў, што хэймвэры сілаю адкажуць «на правакацыю карычневай чумы».

Галодны паход беспрацоўных у Англіі

ЛЁНДАН, 12. (БЕЛТА). Атрады галоднага паходу шатляндзкіх беспрацоўных прыбываюць у **Эдынбург.** Бес працоўныя ўсюды сустракалі гарачы прыём рабочых, якія, наперакор процідзеяньню лейбарысцкіх лідэраў, клапаціліся аб харчаваньні ўдзельнікаў паходу. У шмат якіх месцах рабочыя выходзілі на сустрач беспрацоўным і дэманстравалі разам з імі. У буйных гарадох адбыліся шматлікія мітынгі. Неаднаразовыя спробы паліцэйскіх сарваць паход разьбіліся аб выключную дысцыпліну беспрацоўных. Міністар па справах Шатляндыі **Колінс** вымушан быў прыняць дэпутацыю беспрацоўных.

НА БАРАЦЬБУ З ПУСТАЗЕЛЬЛЕМ

Драпежніцкая, бяссыстэмная эксплёатацыя палёў у дарэвалюцыйны час, пры наяўнасьці распыленых дробных сялянскіх гаспадарак спрыяла пашырэньню пустазельля. Гэта стара скадчына, якая дагэтуль яшчэ не ліквідавана па пашых палёх, зьяўляецца вялікай перашкодай па шляху павышэньня ўраджайнасьці.

Пустазельле кожны год наносіць нашай сельскай гаспадарцы вялізныя страты. Пустазельле заглушае культурныя расьліны, паглынае з глебы спажыўныя матэрыі, якія неабходны для нармальнага развіцьця культурных расьлін, засьмечвае пасеўны матар'ял і зьніжае ўраджайнасьць пашых палёў.

Абсьледваньне засьмечанасьці пасеваў літву ў мінулым годзе ў ільнаводчых раёнах выявіла, што пустазельле зьніжае ўраджайнасьць ільну на 60 проц.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі, увядзеньне пастаянных севазваротаў, замацаваньне за брыгадамі паасобных вучасткаў палёў, наяўнасьць удасканаленых сельска-гаспадарчых машын і прылад стварае спрыяючыя ўмовы для вядзеньня правільнай і сыстэматычна плянавай барацьбы з пустазельлем у кожнай гаспадарцы.

Вярнейшым сродкам у барацьбе з пустазельлем зьяўляецца поліва пасеваў. Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на сваячасовасьць і якасьць поліва. Ні ў якім разе нельга чакаць і запягваць поліва да таго часу, пакуль пустазельле адцьвіце і дасьць насеньне. Сваячасовае поліва зьнішчае пустазельле і забясьпечвае рост культурнай расьліны.

Ня меншае значэньне ў барацьбе з пустазельлем мае чысты папар. Правільная апрацоўка папару сьпяне разьбіцьцё шматгадовага пустазельля. Таму трэба зьвярнуць шчырую ўвагу на догляд за папарам і спачатку вясны да пасеву азімых пакалькі разоў яго ўзорваць, не дапускаючы распаўсюджаньня пустазельля.

Рашучае наступленьне на пустазельле трэба распачаць зараз-жа, бо зьліквідаваньне пустазельля з'эканоміць нам мільёны дэнтнэраў ураджаю.

Я. Герасімовіч.

Беларуская Акадэмія Навук.

Хроніка

* На кіно-фабрыцы «Савецкая Беларусь» пушчан у вытворчасьць кіносцэнарый **«Жулік»,** напісаны беларускім пісьменьнікам т. **Броўка** паводле яго аповесьці «Каландры». Фільм будзе німы.

* Прэзыдыум Менскага гарсавету канчаткова ўстанавіў **маршрут новай трамвайнай лініі** ў раён Кальварыі. Лінія будзе праходзіць па вуліцах Валадарскага, Інтэрнацыянальнай, Рэспубліканскай і Кальварыйскай.

* Былы будынак Менскага гарсавету на пляцу волі перадан для цэнтральнага дому селяніна.

* У Менску арганізуецца **спэцыяльная санітарная міліцыя,** якая будзе сачыць за выкананьнем дырэктыў па санітарыі і гігіене.

* Менскай фабрыцы **«Уцільскур» надана імя т. Тэльмана.**

* Абвешчан **конкурс на лепшае пра вядзеньне дарожнага будаўніцтва** сэзону 1933 г. Для прэміяваньня Галоўдартрансам выдзелен прэміяльны фонд у 80 тыс. руб.

Паведамленьне

— Сёньня, 14-га чэрвеня, а 7-й гадз. увечары ў памяшканьні **Дому** Камасьветы (уваход з вул. **Энгельса**) адбудзецца парада агітмасаў партклектываў і ячэек.

З прычыны важнасьці і тэрміновасьці пытаньняў яўка абавязкова і сваячасова.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Першы ў сьвеце вопытны завод-камбінат па газафікацыі торфу

Вялізарныя запасы торфу ў БССР, бясспрэчна, стануць у бліжэйшыя гады адным з адпраўных пунктаў для далейшага размаху і росту прадукцыйных сіл і індустрыі Савецкай Беларусі.

Дырэкцыя інстытуту эканомікі Беларускай Акадэміі Навук на чале з акадэмікам **Домбалем** паставіла задачу комплекснага вывучэньня тэхналёгічных працэсаў торфу з тым, каб дабіцца атрыманьня з яго газу, высокагатункавых гаручых, аміяку, цукру, сьпірту, сынтэтычнага каўчука і раду іншых каштоўнейшых хэмічных прадуктаў.

Акрамя таго, торф павінен быць шырока выкарыстаны для карэннай рэканструкцыі глебы Беларусі і зьявіцца важнейшым фактарам у справе максымальнага ўзьняцьця ўраджайнасьці.

Інстытут эканомікі Беларускай Акадэміі Навук, разам з тарфяным, хэмічным, агралёгавым, фізыка-матэматычным і геалёгічным інстытутамі прыступіў да арганізацыі **першага ў сьвеце тарфянога вопытнага заводу-камбінату пры Беларускай Акадэміі Навук.**

У аснову яго будуць пакладзены працэсы газафікацыі розных гатункаў торфу. Пры ім-жа арганізуецца рад лябараторый заводзкага тыпу. Завод будзе снабжаць газам новы лябараторны корпус акадэміі, клінічны гарадок і дом друку.

Праект камбінату ў частцы газафікацыі торфу распрацован вядомым вучоным акадэмікам Шкатэлавым. **СНК БССР ухваліў ініцыятыву акадэміі і ўключыў будаўніцтва ў тытульны сьпіс на 1933 год.**

БелАН зьвярнулася з просьбай у Наркамцяжпрам СССР аб разьмяшчэньні заказаў на апаратуру і ўнутранае абсталяваньне заводу-камбінату.

Вопытны завод-камбінат, працуючы на торфе — новая і буйнейшая справа, бо нідзе такога заводу няма. Гэта справа павінна прыцягнуць да сябе ўвагу ўсёй пралетарскай грамадзкасьці з тым, каб далямагчы Беларускай Акадэміі Навук хутчэй дабіцца станоўчых вынікаў і гэтым самым зрабіць пераварот у энэргетычнай гаспадарцы БССР, стварыць аснову для раду вытворчасьцяй, асабліва па лініі хэмічнай прамысловасьці.

Рубілкаўскае сельспаж. тав-а засеяла больш гэктару бульбы нават на незабраванай цапіне.

Перад пускам Касьцюкоўскага гіганту

У ліпені БССР адзначыць яшчэ адну буйнейшую перамогу на фронце індустрыялізацыі краіны. У Касьцюкоўках, каля Гомелю ЗАКАНЧВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА І АБСТАЛЯВАНЬНЕ ГІГАНТУ ЎСЕСАЮЗНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ — МЭХАНІЗАВАНАЙ ГУТЫ. МАГУТНАСЬЦЬ ГУТЫ 30.000 ТОН ВАКОННАГА ШКЛА. Яна дасьць прадукцыі на 14 млн. руб. у год, у той час, як усе 6 гут БССР у гэтым годзе даюць прадукцыі на 9.600.000 руб. На гуце будзе працаваць каля тысячы рабочых. Агульны кошт будаўніцтва — звыш 16 млн. руб. Пабудован новы культурны рабочы гарадок з водаправодам, клюбам, з дапаможнымі гаспадаркамі. Гута падпарадкавана непасрэдна Наркамлёгпраму СССР.

Для забесьпячэньня гуты апалавай базай СНК БССР прапанаваў Белторфтрэсту перадаць ёй торфзавод «Бальшавік» з усёй выпрацоўкай торфу бягучага сэзону.

СНК абавязаў дырэкцыю Гомлкпозаводу неадкладна паставіць перад Наркамлёгпрамам СССР пытаньне аб водпуску неабходных сродкаў, матар'ялаў і абсталяваньня для асваеньня новых плошчаў балот на торфзаводзе «Бальшавік» з тым, каб давесьці выраб торфу на ім у 1934 годзе да разьмераў поўнай патрэбнасьці гуты — да 146.000 тон, замест цяперашняй магутнасьці ў 80.000 тон. Падрыхтоўчыя работы па асваеньні новых плошчаў балот павінны быць закончаны яшчэ ў гэтым сэзоне.

Навуковая сувязь сэрбскай каралеўскай Акадэміі Навук з Акадэміяй Навук Беларусі

Першы віцэ-прэзыдэнт Акадэміі Навук Беларусі акадэмік **Домбаль** атрымаў запытаньне з Белграду (Югаславія) ад сакратара сэрбскай каралеўскай Акадэміі Навук наводнт узаемнага абмену кніжнай прадукцыяй.

Беларуская Акадэмія Навук адказала прыцьцішовай згодай аб наладжаньні навуковага кантакту паміж абедзьвюма акадэміямі навук.

Мастацкае афармленьне дому ўраду

Работа па мастацкім афармленьні дому ўраду ідзе поўным ходам. Брыгада мастакоў у складзе т. т. **Керзіна, Азгура, Ізмайловіча і Арлова** канчае работу па лепцы бюстаў клясыкаў марксызму і рэвалюцыйных дзеячоў: **Маркса, Энгельса, Бабефа, Чарнышэўскага** і інш. Заслужаным дзеячам мастацтва, скульптурам Манізарам заканчваецца ў Ленінградзе адліўка вялізнай бронзавай фігуры **Леніна.** Мастак Лебедзева прыступіла да афармленьня плафонаў (столяў).

Унутры будынку мяркуецца зрабіць рад мастацкіх кампазыцый на тэму: «Кастрычнік у Ленінградзе» і «Кастрычнік у БССР».

Хроніка ўсесаюзнага сьвята па цяжкай атлётыцы

Мандатная камісія ўсесаюзных спаборніцтваў па цяжкай атлётыцы зарэгістравала прыбыцьцё 200 удзельнікаў. Па асобных рэспубліках і абласьцях удзельнікі спаборніцтва разьбіваюцца наступным чынам: самы вялікі калектыў дала Масква — 29 чалавек, далей ідзе УКРАІНА — 28, ЛЕНІНГРАД — 27, ГОРКАЎСКІ край — 13, ПАЎНОЧНЫ КАЎКАЗ і ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦЬ — па 10 чалавек, КАРЭЛЬСКАЯ АССР — 9, УЗБЭКІСТАН і ІВАНАЎСКАЯ вобласьць па 5 чалавек, ЦЧВ — 4 чалавекі. АД БССР У СПАБОРНІЦТВАХ ПРЫМАЕ / ЎДЗЕЛ 25 ЧАЛАВЕК.

Сярод прыехаўшых — дзесяткі чэмпіёнаў РСФСР і іншых рэспублік-пераможцаў на ўсесаюзнай спартакіядзе 1928 году і ўсесаюзных спаборніцтвах «Дынамо» 1933 году.

***

У памяшканьні гімнастычнай залі ўсебеларускага стадыёну АДКРЫЛАСЯ ВЫСТАЎКА, ПРЫСЬВЕЧАНАЯ 10-ГАДОВАМУ ЮБІЛЕЮ ФІЗКУЛЬТУРНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ БССР.

У 12-ці аддзелах выстаўкі дан паказ усіх відаў фізкультурнай работы і росту фізкультурнага руху ў БССР. На выстаўцы сотні фатаграфій, малюнкаў, дыяграм. Заля мастацка афармлена прадстаўляе сабою макет ўсебеларускага стадыёну.

***

ВСФКБ атрымаў з Харкава наступную прывітальную тэлеграму: «Фізкультурнікам братэрскай сацыялістычнай Беларусі ў дзень дзесяцігодзьдзя гарачае прывітаньне ад часопісі «Фізкультурнік Украіны».

***

Белдзяржкіно выпускае спэцыяльную **кіно-часопісь «За сацыялістычную Беларусь»,** прысьвечаную 10-гадоваму юбілею фізкультурнай арганізацыі БССР і ўсесаюзнаму спартыўнаму сьвяту. Ужо засьняты моманты ўсебеларускай спартакіяды і парад. Будзе таксама засьнят ход усесаюзных спаборніцтваў.

***

Учора а 5 гадз. дня у клюбе харчавікоў імя Станіна пачаліся спаборніцтвы паміж камандамі па барацьбе, боксу і падняцьцю цяжараў.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чырвоная Зорка Каса—ад 1 г. дня. Замежны мастацкі фільм **БЭЛА ДОННА**

„ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ" Мастацкі фільм **„А Э Л І Т А"** (АНТА!... АЦЭЛІ!... УТА!...)

„ПРАЛЕТАРЫ" Мастацкі замежны фільм **„Чалавек, які сьмяецца"** драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ кіно-тэатр Каса—з 1 г. дня. Мастацкі фільм **САЛДАЦКІ СЫН** у 6 частках.

КІНО „СПАРТАК" З 14 чэрвеня МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **КРЫЖ і МАЎЗЭР** драма ў 7 частках. ШТОДЗЕННЯ 6 СЭАНСАЎ. Каса—з 3 гадзін 30 мін. дня.

МЕНСКІ **ДАШКОЛЬНЫ ТЭХНІКУМ** абвяшчае НАБОР на 1-шы курс **160 чал. беларускае і яўрэйскае аддзяленьні.**

Таксама праводзіцца набор і ў вячэрні тэхнікум без адрыву ад вытворчасьці на 60 чал.

Прымаюцца асобы з ведамі за 7 груп. Заявы з дакумантамі прымаюцца да 15-га жніўня.

Студэнты будуць забясьпечаны стыпэндыяй і інтэрнатам.

Адрас: Менск, Савецкая, 144, Менскі дашкольны тэхнікум.

Дырэкцыя.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ Т-ВА Чырвонага Крыжу (Менск, Першамайская вул., дом № 7)

ШУКАЕ наступных грамадзян, якім належыць з Амэрыкі **страхоўка, пэнсія і інш. віды ўзнагароды** пасьля памёршых там іх родных.

АДШУКВАЮЦЦА:

1) **Бацькі СТРОНГІНА Самуіла.**
2) **Рахіль РУБІНА—маці РУБІНА Макса.**
3) **Бацькі ПАСМУКСКАГА Ігната.**
4) **Мар'я ЦЫБІК—сястра Цыбіка Лукі.**
5) **Еўданія Барон—маці Барона Давіда.**
6) **Іван і Іосіф ГЕНКОЎСКІ — браты Генкоўскага Пятра (Жэнкоўскія) (Жэнкоўскага).**
7) **Іван і Мар'я РОХІНЫ—бацька і сястра РОХІНА Дж. (Родзін).**
8) **Петр МІЧНІК—бацька Пятра Мічніка.**

Увага: Трэба ведаць, што прозьвішчы з Амэрыкі часта даюцца перабылтанымі пры перакладзе з ангельскай мовы на расійскую.

АСОАВІЯХІМАЎЦЫ! Работнікі ПВО і грамадзянскага паветранага флёту! Не спазьнеецеся **ПАДПІСАЦЦА з 1-га ЛІПЕНЯ.** Забясьпечце сябе штомесячнымі часопісямі:

„САМОЛЕТ" —орган ЦС Асоавіяхіму. 12 мес.—12 р., 6 мес.—6 р., 3 мес.—3 р.

„ХИМИЯ и ОБОРОНА" —орган ЦС Асоавіяхіму: 12 мес.—9 руб. 60 к., 6 мес.—4 р. 80 к., 3 мес.—2 р. 40 к.

Падпіска прымаецца ў любым паштовым аддзяленьні, арганізатарамі і баёршчыкамі і падпіскі Саюздруку.

АРГАНІЗУЙЦЕ КАЛЕКТЫЎНУЮ ПАДПІСКУ.

Падпіска на працяжныя тэрміны—гарантыя найбольш акуратнага і бесьперабойнага атрыманьня.

ЖУРНАЛЬНА-ГАЗЭТНАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ.

ВІЦЕБСКІ РАБФАК пры Індустр.-пэдаг. інстытуце абвяшчае **АСЕНЬНІ НАБОР** студэнтаў на дзенныя і вячэрнія групы ўсіх курсаў і 3 курс яўрэйскага аддзяленьня ў горадзе і ў пралетарска-слабодзкім філіяле.

Вячэрнія групы працуюць без адрыву ад вытворчасьці і стыпэндыяй не забясьпечваюцца.

Дзенныя групы першага курсу забясьпечваюцца стыпэндыяй на 75 проц., 4курс веч. Рабфаку на 50 проц., астатнія курсы на 100 проц. Стыпэндыяты забясьпечваюцца інтэрнатам.

Прыём па іспытах, якія адбудуцца 1 верасьня, пачатак зонтаў [illegible]. Прыём заяў да 25 жніўня [illegible] Віцебск, Валадарскага № 38-15. [illegible] Прыём згодна правіл НКП.

Дырэкцыя.

ФЗВ панчошнікаў —АБВЯШЧАЕ— **НАБОР ВУЧНЯЎ** у колькасьці 350 чалавек у беларускую і яўрэйскую групы.

Прымаюцца выключна дзяўчаты ва ўзросьце ад 15 да 18 год, з адукацыяй за 4, 5, 6 і 7 груп.

ФЗВ рыхтуе кадры для панчошных фабрык „Кл. Цэткін" і „КІМ" па наступных кваліфікацыях: трыкатажніц, катлёўшчыц і вязальшчыц.

Вучні забясьпечваюцца інтэрнатам, стыпэндыяй і сталоўкай і забясьпечаньне атрымліваюць па катэгорыі рабочых гэтай прамысловасьці.

Трэба прадставіць дакументы: аб узросьце, аб сацыяльнім, аб адукацыі.

Канцылярыя працуе з 10 г. ран. да 5 гадз. дня.

Дакументы дасылаць па адрасу: г. Віцебск, Ленінская 3-2, ФЗВ панчошнікаў.

УСЕБЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ паведамляе ўсе арганізацыі, што **ДА 15-га ЧЭРВЕНЯ г. г.** ПАВІННЫ БЫЦЬ ПРАДСТАЎЛЕНЫ **касавыя пляны на III-ці квартал 1933 год у памесячнай разьбіўцы.**

Пляны павінны складацца па ўстаноўленай форме.

Арганізацыям, якія не прадставілі касавага плян, у паказаны тэрмін **будзе спынена выдача наяўных.**

БЕЛКАНТОРА ДЗЯРЖБАНКУ.

АБВЕСТКА

БЕЛАРУСКАЯ КАНТОРА „РЕММАШТРЕСТ"

У сувязі са зьменай мэтадаў работы па выяўленьні і рэалізацыі абязчнага і бязьдзейнага абсталяваньня, даводзіць да ведама ўсіх прадпрыемстваў Беларусі, што на падставе пастановы Савету Працы і Абароны ад 9 красавіка 1933 году і пастановы СНК ад 20 красавіка 1933 году за № 774 актацыя і рэалізацыя памянёнага абсталяваньня робіцца на наступных пачатках:

1. Менская кантора **„Реммаштрест"** у сілу прадстаўленага ёй манапольнага права рэалізацыі ўказанага абсталяваньня **актуе і набывае апошняе за цьвёрды кошт**—на ўмовах аплаты:

а) Абсталяваньне дэфіцытнае, ня бытавое ў рабоце, або са зношанасьцю ня больш 10 проц., якое можа быць пушчана ў эксплёатацыю без рамонту,—аплачваецца пасьля падпісаньня акту-зьдзелкі ў разьмерах 50 проц. кошту яго і астатняй сумы супроць адгрузачных дакумантаў.

б) Абсталяваньне дэфіцытнае, са зношанасьцю максымальна на 40 проц., якое патрабуе незначнага рамонту або якое зусім ня было ў рабоце, але якое ня мае шырокага ўжываньня ў прамысловасьці—аплачваецца пасьля падпісаньня акту-зьдзелкі ў разьмерах 50 проц. кошту яго і астатняй сумы супроць адгрузачных дакумантаў.

в) Усе іншае абсталяваньне, якое патрабуе значнага рамонту, або новае, але вузка спэцыяльнае, а таксама якое не выкарыстоўваецца з прычыны адсутнасьці сырцу,—аплачваецца прыстасоўна да цэн мэталяному з наступным пераразьлікам пасьля рэалізацыі.

2. Ацэнка абстаяваньня робіцца згодна дзейных прэйскурантных цэн дзяржпрамгаў з улікам процанту зносу. Намэнклятура абсталяваньня на групах аплаты зацьвярджана НКЦП СССР.

ЗАЎВАГА: Разгаворсьці ў вызначэньні груп процанту зношанасьці і ацэнкі разглядаюцца арбітражам у НКЦП, згодна загаду апошняга ад 26 красавіка 1933 г. за № 226.

3. Раней складзеныя на камісійных пачатках акты і заключныя дагавары па бязьдзейным абсталяваньні **АНУЛЮЮЦЦА** і падлягаюць перагляду са складаньнем новых актаў-зьдзелак і дагавораў.

4. Афармленьне здачы абсталяваньня робіцца на адзінай форме акту-зьдзелкі з выдачай фондатрымальнікам абсталяваньня захвальных расьпісак „Реммаштреста" і банку.

5. Весткі на лішнае абсталяваньне, якое павінна быць перадана „Реммаштресту", прадстаўляюцца згодна формы, зацьверджанай НКЦП СССР па адрасу: **Менск, Інтэрнацыянальная 2, Беларуская кантора „Реммаштрест" тэл. 23-727.**

14 чэрвеня, а 7 гадзіне ўвечары ў ДОМЕ КАМАСЬВЕТЫ, (вуліца Карла Маркса, 47) адбудзецца **ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ РАБКОРАК І ЧЫТАЧАК ЧАСОПІСІ „РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ".**

Парадак дня:

1. Даклад аб месячніку друку. Судаклад рэдакцыі часопісі «Работніца і калгасьніца Беларусі». 2. Рознае.

Пасьля канфэрэнцыі—канцэрт.

Мандаты атрымаць у рэдакцыі часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі", Савецкая, 63, 3-ці паверх, пакой № 11 ад 9 гадзін раніцы да 8-мі гадзін вечара.

Модус—ад 5-ці чалавек 1 дэлегат.

Менгарком КП(б)Б.

Рэдакцыя часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі".

ПАДПІСЧЫКІ „ЗЬВЯЗДЫ"!

**П